Пролетарыі ўсіх краін, еднайцеся!

ЛІТАРАТУРА І МАСТАЦТВА

ОРГАН ПРАЎЛЕННЯ САЮЗА СОВЕЦКІХ ПІСЬМЕННІКАЎ БССР І УПРАЎЛЕННЯ ПА СПРАВАХ МАСТАЦТВАЎ ПРЫ СНК БССР

№ 40 (496) | Нядзеля 8 снежня 1940 года | Цана 20 кап.

Янку Купале, выдатнаму песняру совецкай зямлі, вернаму сыну беларускага народа,—гарачае прывітанне!

★

Янка Купала

Трыццаць пяць год назад у мінскай газеце «Северо-западный край» быў надрукаван верш «Мужык», падпісаны скромным і нічога не гаворачым тады імем: «Янка Купала». Ніхто з чытаўшых у той час верш Янкі Купалы, не мог уявіць, у якую велізарную паэтычную велічыню вырасце з часам гэты скромны вясковы юнак. І не было сярод супрацоўнікаў цабрадзейнай рэдакцыі ні аднаго, які-б разгадаў у няпрошаным маладым паэце яго красную і непрымірымую сілу. А верш быў зусім не «бяскрыўдны» і «мірны»:

І кожны, хто мяне спытае,
Пачуе толькі адзін крык:
Што хоць мной кожны пагарджае,
Я буду жыць! — бо я мужык!

Так пачынаў Янка Купала. І да таго часу, як з'явіўся яго першы верш, беларуская літаратура ведала творы аб сялянах, аб бедным сялянскім жыцці. Але не было ў ёй вершаў, у якіх-бы просты занядбаны мужык з такой гордасцю і праматой узнёс сваё паруганае імя і пачуццё свайй уласнай чалавечай годнасці. Янка Купала ўпершыню загаварыў не толькі аб мужыку, але і ад яго імя. Герой верша і яго аўтар зліліся ў адным жывым і непаўторным вобліку прарока, баяна, паэта знясіленай беларускай вёскі. У яго вялікім чалавечым сэрцы адказным болем азваўся боль, які накапіўся ў цэлым народзе, і ўпартае сэрца паэта нарадзіла сапраўды громапосныя, перуновыя словы, якія агнём сваім здольны былі спапяліць абступаўшыя жыццё крыжы... Аб Янку Купале нельга сказаць, што ён адлюстраваў жыццё беларускай вёскі,—ён быў яе сэрцам, яе голасам, яе самасазнаннем. Мала сказаць аб Янку Купале, што ён у сваіх вершах выразіў істотныя этапы народнага рэвалюцыйнага руху, — ён сам быў рэвалюцыяй у дзеянні. Яго голасам загаварыла шматмільённае сялянства, якое патрабавала зямлі, волі, нацыянальнай свабоды. Яго паэтычная творчасць стала правадніком тых дэмакратычных ідэалаў, тых патрабаванняў сацыяльна-эканамічнага парадку, якія працоўнае сялянства прад'яўляла ў буржуазна-дэмакратычнай рэвалюцыі. Верш Янкі Купалы з'яўляўся магутным ідэалагічным фактарам, народжаным рэвалюцыяй 1905 года і, у сваю чаргу, рэвалюцыянізіруючым сазнанне сялянскіх мас.

Такім ён прышоў у соцыялістычную рэвалюцыю. Янка Купала горача і з захапленнем апеў Вялікі Кастрычнік. Ён стварыў здзіўляючай пяшчотнасці і чыстаты вобраз новай, Совецкай Беларусі, ён склаў патэтычныя гімны ў славу совецкай моладзі, ён апеў першыя крокі новай, соцыялістычнай вёскі і яе няўхільны бурны рост.

Поспехі соцыялістычнага будаўніцтва, паспяховае правядзенне ленінска-сталінскай нацыянальнай палітыкі, клопаты комуністычнай партыі і асабіста таварыша Сталіна аб кадрах совецкай інтэлігенцыі — усё гэта і стварыла тыя ўмовы, у якіх вялікі дэмакратычны паэт Янка Купала, народжаны народным рэвалюцыйным рухам, зрабіўся натхнёным песняром соцыялізма, стаў паэтычным глашатаем ідэй комуністычнай партыі.

Сёння Янка Купала апявае шчаслівае і радаснае жыццё свайго народа пад жыватворчымі праменнямі Сталінскай Канстытуцыі. Паэт славіць Сталіна, які цудоўныя казкі ператварыў у жыццё, які ажыццявіў мары народа аб шчасці. У песнях Янкі Купалы, прысвечаных вялікаму Сталіну, столькі ўсхваляванага чалавечага пачуцця, столькі сілы, што песні гэтыя сталі здабыткам усяго совецкага народа. Выражаючы сваё пачуццё ўдзячнасці вялікаму Сталіну, паэт тым самым выражае пачуцці і мыслі ўсяго шматмільённага совецкага народа.

Свабодная совецкая песня Янкі Купалы гучыць над краінай. Пранікаючы на Украіну, яна становіцца украінскай, у Грузію — грузінскай, у Арменію — армянскай. Надрукаваны ў свой час на старонках «Правды» верш Янкі Купалы «Алеся» стаў украінскай народнай песняй аб вясковай дзяўчыне, якая падобна сваёй беларускай сястры, «паляцела да сонца пералётнай птушкай». Запісаная з вуснаў украінскіх калгасніц «Алеся» зноў вярнулася ў «Праўду», ужо ў выглядзе украінскай народнай творчасці. Такая трансфармацыя верша «Алеся», аднаго з лепшых твораў соцыялістычнай лірыкі; такая сіла ўздзеяння жывых паэтычных вобразаў, народжаных пачуццём і мысляю ўсхваляванага і разумнага песняра сталінскай эпохі — Янкі Купалы.

Янка Купала — паэт вялікага з'еднанага беларускага народа, які ў непарушным саюзе з усімі совецкімі народамі, будуе комунізм.

Трыццаціпяцігоддзе творчай дзейнасці Янкі Купалы — гэта вялікае свята ўсёй совецкай краіны, гэта яшчэ адно сцвярджанне перамог ленінска-сталінскай нацыянальнай палітыкі. З далёкага Казахстана звіняць гукі дамбры Джамбула, які вітае беларускі народ з юбілеем Янкі Купалы; свабодныя украінскія песняры працягваюць свае рукі, каб пацісн уць далонь беларускага народнага песняра; паэты ўсіх народаў і рэспублік адгукаюцца самымі чыстымі і высокімі галасамі на песню Янкі Купалы. І ўсе гэтыя галасы і песні зліваюцца ў адной магутнай паэтычнай сімфоніі ўдзячнасці нашай бальшавіцкай партыі, любві і адданасці Сталіну — сейбіту народнага шчасця.



Сёння грамадскасць Совецкай Беларусі адзначае 35-годдзе літаратурна-мастацкай і грамадскай дзейнасці народнага паэта БССР ордэнаносца Янкі Купалы. На здымку: Янка Купала.

Мінск, Янку Купале

Дарагі Іван Дамінікавіч! У дзень трыццаціпяцігоддзя Вашай творчай дзейнасці на славу і на карысць народа Совецкай Беларусі, мы ад імя ўсяго шматнацыянальнага калектыва Совецкіх пісьменнікаў шлем Вам словы гарачага брацкага прывітання, шчырай глыбокай павагі.

У годы свайго паэтычнага юнацтва Вы напісалі сардэчныя, прасякнутыя светлай надзеяй радкі:

«Шчасце так рэдка над светам усходзе,
Усё-ж досыць бывае мені хоць мала,—
Долю каб бачыў у родным народзе,
А быў-бы шчаслівы Янка Купала».

Даўно напісаны гэтыя радкі. Шмат дзён прайшло. Шмат праліта слёз народных, крыві народнай ў імя таго, што мроілася Вам у юнацкіх марах. Страшны плуг разбураючай імперыялістычнай вайны прайшоў па палях змардаванай Беларусі. Драпежныя банды польскіх паноў-інтэрвентаў рыскалі па яе спустошаных сёлах.

У годы крыві і гора знайшоў шматпакутны народ Беларусі сонечную праўду Леніна—Сталіна, знайшоў сваё працоўнае шчасце ў брацкай сям'і народаў Саюза Совецкіх Соцыялістычных Рэспублік. І Вам, песняру народных спадзяванняў і шчасця выпала радасная доля апець шчасце, здабытае ў баю.

За тое, што Вы падзяліўшы з народам горкую няволю прыгнечання, мужна і горда неслі званне паэта—грамадзяніна радзіма назвала Вас сваім народным паэтам. За тое, што Вы разам са сваімі сябрамі—аднагодкамі пад улюлюканне рускіх і польскіх шавіністаў самаадданна зачыналі новую беларускую літаратуру і разам з маладымі пісьменнікамі Беларусі будуеце новую літаратуру соцыялізма, урад Саюза ССР удастоіў Вас вышэйшай узнагароды ордэна Леніна.

Вялікая Кастрычніцкая соцыялістычная рэвалюцыя напаўняла Вашы песні неувядаючай бадзёрасцю маладосці, зрабіла іх здабыткам усіх народаў нашай соцыялістычнай радзімы.

Ад усяго сэрца жадаем Вам сіл, здароўя, радасці новых творчых перамог, невычарпальнай шчодрасці Вашага цудоўнага песеннага дару.

ПРЭЗІДЫУМ САЮЗА СОВЕЦКІХ ПІСЬМЕННІКАЎ СССР.

Дарагі Іван Дамінікавіч!

Мы шчаслівы вітаць Вас у дзень слаўнага 35-годдзя літаратурнай дзейнасці.

Трыццаць пяць год назад, у змрочныя часы царызма ўпершыню магутна прагучала Ваша мастацкае слова, якое заклікала беларускі народ да барацьбы за соцыяльнае і нацыянальнае вызваленне.

З'яўляючыся заснавальнікам беларускай мастацкай літаратуры, Вы, Іван Дамінікавіч, на сваім творчым шляху жылі думамі народа, апяваючы яго гаротнае жыццё і будзячы ў ім волю да барацьбы супроць прыгнятальнікаў.

Вялікі Кастрычнік даў шырокую дарогу ў жыццё беларускаму народу ў братняй сям'і народаў Совецкага Саюза. Пышна расцвіла і Ваша творчасць у наш шчаслівы совецкі час. Соцыялістычнае будаўніцтва, заможнае жыццё калгаснікаў, шчаслівая доля жанчыны і нашых дзяцей, слава партыі і мудрасць правадыра народаў любімага Сталіна — з вялікім натхненнем і майстэрствам апета Вамі ў шматлікіх вершах і паэмах.

Вялікая радасць працаваць разам з Вамі. Сотні маладых пісьменнікаў выраслі і растуць на ўзорах Вашай творчасці.

Ад шчырага сэрца жадаем Вам, Іван Дамінікавіч, многа год жыцця, здароўя і плённай працы на славу нашай дарагой соцыялістычнай радзімы.

Няхай Ваша ўзброенае слова, як і раней, будзе непрымірыма да ворагаў і невычэрпна ў сваім багацці, услаўляючы наша шчаслівае жыццё, эпоху вялікага Сталіна!

ПРАЎЛЕННЕ САЮЗА СОВЕЦКІХ ПІСЬМЕННІКАЎ БССР.

Івану Дамінікавічу Купале

Дарагі Іван Дамінікавіч! Віншуем Вас ад шчырага сэрца з 35-годдзем Вашай слаўнай, плодатворнай дзейнасці на ніве беларускай літаратуры, Вашага сумленнага служэння працоўнаму народу. Вітаем Вас як высокаталенавітага паэта-грамадзяніна. Жадаем вам доўгіх год шчаслівага жыцця і радаснай творчасці

ПРАЎЛЕННЕ САЮЗА СОВЕЦКІХ ПІСЬМЕННІКАЎ УКРАІНЫ.

Кіеў.

★

Мінск, ССП БССР Янку Купале

Пісьменнікі Совецкай Грузіі з пачуццём гарачай любві вітаюць дарагога Івана Дамінікавіча, старэйшага пісьменніка братняй Беларускай рэспублікі, яе народнага паэта, у сувязі з 35-годдзем яго літаратурнай дзейнасці. Грузінскія пісьменнікі ад усяго сэрца жадаюць Вам, аднаму з аснавапаложнікаў і класікаў беларускай літаратуры, далейшай плодатворнай работы па стварэнню ўсё новых і новых шэдэўраў, якія несумненна ўвойдуць у скарбніцу літаратуры нашай вялікай шматнацыянальнай радзімы.

Вашы выдатныя вершы аб Грузіі, Вашы неаднаразовыя наведванні нашай радзімы ўмацоўвалі братнюю дружбу беларускага і грузінскага народаў.

Няхай жыве сталінская дружба народаў, невычэрпная крыніца нашай творчасці!

Няхай жыве шчыры друг грузінскіх пісьменнікаў Янка Купала!

Абашыдзе, Дадзіані, Кіачэлі, Месхашвілі, Чыкавані, Зулі, Радзіані.

Тбілісі.

Мінск, Саюзу совецкіх пісьменнікаў Беларусі

Саюз пісьменнікаў Латвійскай ССР пасылае палымнае братняе прывітанне вялікаму народнаму пісьменніку Совецкай Беларусі Янку Купале ў дзень святкавання яго 35-гадовай літаратурнай дзейнасці.

Няхай жыве Совецкая Беларусь і яе літаратура!

Няхай жыве сталінская дружба народаў.

Саюз пісьменнікаў Латвійскай ССР.

Рыга.

Мінск, Янку Купале

Саюз совецкіх пісьменнікаў Азербайджана горача вітае Вас у дзень Вашай 35-гадовай літаратурнай дзейнасці. Вы з'яўляецеся адным з верных і адданых сыноў беларускага народа, прысвяціўшым свае сілы і талент служэнню народнаму мастацтву.

Жадаем Вам доўгай і плодатворнай работы на карысць нашай соцыялістычнай радзімы.

Прэзідыум совецкіх пісьменнікаў Азербайджана.

Баку.

Мінск, Янку Купале

Праўленне Ленінградскага Саюза совецкіх пісьменнікаў горача віншуе Вас з 35-гадовым юбілеем і жадае Вам на доўгія годы здароўя і поспехаў у Вашай творчай рабоце.

Пракоф'еў, Тіханаў, Зошчэнка, Лаўрэнёў, Каверын, Форш, Слонімскі.

ШЧЫРАЕ ПРЫВІТАННЕ!

Сардэчна віншую, жадаю здароўя і доўгіх год пладатворнай творчай работы. Моцна цісну руку.

А. ФАДЗЕЕЎ.

Дарагому другу!

Моцна абдымаю дарагога друга, вялікага беларускага песняра, песняра свабодных народаў Саюза ССР ад імя паэтаў сонечнай Грузіі. Віншую тваю слаўную трыццаціпяцігадовую творчую дзейнасць. Слава народу вырасціўшаму цябе.

Георгі ЛЕАНІДЗЕ.

Мінск, народнаму паэту Янку Купале

Горача віншую з выдатным творчым юбілеем гордасць беларускага народа і ўсёй нашай вялікай радзімы — дарагога Янку Купалу.

Ад душы жадаю шмат сіл і здароўя, шмат год творчай дзейнасці на карысць шматнацыянальнай совецкай культуры. Слава Вашаму цудоўнаму таленту, што падарыў нам палымную паэзію, народжаную ў крыштальнай крыніцы народных дум і сагрэтую Вашым выдатным сэрцам!

Абнімаю, моцна цісну Вашу руку.

Алесь КАРНЕЙЧУК.

Кіславодск.

Янку Купале

Дарагому юбіляру, слаўнаму паэту Беларусі шмат год жыць, спяваць і радавацца.

В. БАХМЕЦЬЕЎ.

Масква.

***

Горача вітаю маршала арміі паэтаў нашай вялікай соцыялістычнай радзімы. Па-сяброўску абнімаю, цалую.

Іцык ФЕФЕР.

Кіеў.

***

Шчыра вітаю Вас, цудоўнага майстра слова і любімага народнага паэта. Сардэчнае прывітанне!

А. КАПЫЛЕНКА.

Кіеў.

Чацвертая гадавіна Сталінскай Канстытуцыі

Прайшло чатыры годы з тых гістарычных дзён, калі Надзвычайны VIII Усесаюзны з'езд Советаў прыняў новую Канстытуцыю Саюза ССР — Канстытуцыю краіны перамогшага соцыялізма. Вялікі совецкі народ назваў сваю новую Канстытуцыю імем яе тварца, імем якое ўвасабляе ўсю мудрасць і сілу народа, — Сталінскай Канстытуцыяй.

Сталінская Канстытуцыя, народжаная велічнымі перамогамі соцыялізма ў нашай краіне, з'явілася сцягам совецкага народа ў яго пабеданосным руху на шляху к комунізму.

Сталінская Канстытуцыя забяспечыла найвялікшы росквіт эканомікі і культуры народаў Саюза ССР. Яна гарантыравала грамадзянам соцыялістычнай краіны вялікія, нябачныя дагэтуль у гісторыі чалавецтва правы: на працу, на адпачынак, на асвету, на матэрыяльнае забеспячэнне ў старасці і ў выпадку хваробы альбо страты працаздольнасці. Яна акрэсліла асноўныя абавязкі будаўнікоў комунізма: выконваць законы, захоўваць дысцыпліну працы, сумленна адносіцца да грамадскага абавязку, паважаць правілы соцыялістычнага агульнажыцця; берагчы і ўмацоўваць грамадскую, соцыялістычную ўласнасць. І ні на хвіліну не забываць, што абарона бацькаўшчыны ёсць свяшчэнны абавязак грамадзяніна СССР.

Дзень Сталінскай Канстытуцыі — усенароднае свята. І гэта свята совецкі народ сустрэў новымі гістарычнымі перамогамі соцыялізма. Вырас, пашырыўся Совецкі Саюз. Пад сцягам Сталінскай Канстытуцыі — 193-мільённы совецкі народ, 16 совецкіх рэспублік. Цудоўна змяніліся, расквітнелі пад сонцам Сталінскай Канстытуцыі землі, стаўшыя пад пабеданосны чырвоны сцяг Советаў. Гэта яскрава дэманструюць заходнія вобласці нашай рэспублікі. Стаў буйным тэкстыльным цэнтрам Беласток. Рэканструіраваны і ўведзены ў строй соцыялістычнай прамысловасці сотні прадпрыемстваў у гарадах, раённых цэнтрах заходніх абласцей. Збудаван у рэкордна сціслы тэрмін Днепра-Бугскі канал, праз які злучаецца Чорнае мора з Прыбалтыкай. З дня на дзень шырыцца калгасны рух. Цяпер у заходніх абласцях у разгары падрыхтоўка да выбараў у мясцовыя Советы дэпутатаў працоўных. Лепшых людзей, адданых партыі і народу, вылучылі выбаршчыкі кандыдатамі ў дэпутаты мясцовых органаў Совецкай улады. Сярод кандыдатаў сталінскага блока комуніс[тычных і беспартыйных] партыйных не мала прадстаўн[ікоў совец]кай інтэлігенцыі, у прыватнасці [пісьмен]нікі, артысты, мастакі — майстры [соцыя]лістычнай культуры, якая пышна [расцві]тае на разняволеных землях, [дзякуючы] ажыццяўленню ленінска-сталінска[й нацыя]нальнай палітыкі, дзякуючы [клопатам] партыі Леніна—Сталіна.

Совецкі народ працай і [подзвігамі] ўслаўляе сваю соцыялістычну[ю радзіму,] умацоўвае яе магутнасць. На [по]двігі на славу радзімы натхня[е кожнага] совецкага патрыёта Сталінска[я Канстыту]цыя.

Выдатнымі поспехамі прам[ысловасці,] далейшым ростам яе, бліску[чым выкана]нем вытворчых планаў, [...] скай гаспадаркі — зборам [...] даў пудоў збожжа, поспехам[і і] творчымі перамогамі ва ў[сіх галінах ма]стацтваў, у літаратуры, н[...] чацверты год Сталінскай Ка[нстытуцыі. Гэ]ты год быў асабліва знам[енальны для] пісьменнікаў, работнікаў м[астацтва Со]вецкай Беларусі. Майстры [...] публікі паказалі сваю твор[часць на дэка]дзе беларускага мастацтва ў Маскв[е. На]тхнёныя поспехам дэкады, яны п[...] на твораць на карысць далейшаг[а росквіту] ця і ўзбагачэння мастацтва бела[рускага] народа. Рад таленавітых твораў далі [...] му чытачу пісьменнікі Совецкай Б[еларусі.] Саюз совецкіх пісьменнікаў БССР папаўняецца за лік беларускіх, п[ольскіх,] яўрэйскіх майстроў мастацкага сл[ова,] прадстаўнікоў народаў заходніх а[бласцей,] а таксама за лік вырасшага мала[дога па]паўнення кадраў літаратуры.

У слаўны пяты год Сталінскай [Кансты]туцыі ўступіў вялікі Совецкі Саю[з.]

Совецкі народ змагаецца за но[вы рост] прадукцыйнасці працы як у сэ[нсе коль]касці, так і ў сэнсе якасці пра[цы,] умацоўвае дысцыпліну соцыяліс[тычнай] працы, няспынна павялічвае ма[гутнасць] свайй радзімы. Гэта барацьба, поспе[х якой] абумоўліваецца комуністычным выха[ваннем] мас, з'яўляецца выпаўненнем Ас[ноўнага] закона нашай соцыялістычнай дзяржа[вы —] Сталінскай Канстытуцыі.

Па шляху комунізма пабедаповна і[дзе] совецкі народ пад сцягам Сталінскай Канстытуцыі, пад мудрым вадзіцельствам тварца яе — вялікага правадыра народаў таварыша Сталіна.

УСЕНАРОДНАЕ СВЯТА

5 снежня — дзень радасці і лікавання народаў нашай радзімы, дзень вялікага ўсенароднага свята. Для народаў Совецкага Саюза Сталінская Канстытуцыя ёсць замацаванне заваяваных перамог соцыялізма. Для працоўных капіталістычных краін Сталінская Канстытуцыя — магутная ідэйная зброя супроць капіталізма, якая ўказвае на адзіны шлях да свабоднага і раднаснага жыцця — на шлях працоўных Совецкага Саюза, на шлях соцыялістычнай рэвалюцыі.

Рабочыя, сяляне, інтэлігенцыя жывуць і працуюць на пачатках дружнага супрацоўніцтва, складаючы совецкае грамадства, дзе праца на карысць народа з'яўляецца справай гонару, справай славы, доблесці і геройства.

Непарушная братняя дружба народаў СССР, замацаваная Сталінскай Канстытуцыяй, з'яўляецца неацэнімай па свайму сусветна-гістарычнаму значэнню перамогай ленінска-сталінскай нацыянальнай палітыкі.

Мы, работнікі мастацтваў Беларускай ССР, у чэрвені 1940 года ў Маскве на дэкадзе беларускага мастацтва ярка, на ўсё жыццё запечатлелі дружны, братні прыём і ўвагу да нас з боку нашых старэйшых братоў, прадстаўнікоў вялікага рускага народа, з боку кіраўнікоў партыі і ўрада. З якой пяшчотнай цеплынёй і ўвагай былі сустрэты нядаўна прадстаўнікі бурат-мангольскага народа ў Маскве! Усе мы, беларусы, украінцы, узбекі, кіргізы, казахі, грузіны, армяне, бурат-манголы, хто пабываў на дэкадзе ў Маскве, — усе ў аднолькавай меры імкнуліся ў Маскву, у сэрца нашай цудоўнай радзімы, каб прадэманстрыраваць тыя поспехі, якія дасягнуты намі [...] і пяшчотнай увагай па[ртыі і] ўрада. Імкнуліся паказа[ць, як] жыве, як пышна, як [...] шчасце народаў, як ра[с]квітнее наша магутная [...] радзіма пад сонцам Сталінска[й Канстыту]цыі. Наколькі прыцягальна с[іла ідэ]і Сталінскай Канстытуцы[і, свед]чыць тое, што вызваленыя [наро]ды Беларусі, Заходняй Ук[раіны] і Паўночнай Букавіны, Літв[ы...] ні сваё першае жаданне [стаць] пад чырвоны сцяг Краі[ны Советаў,] пад сцяг Сталінскай Канс[тытуцыі, якая] будзе забяспечан шчаслівы [...] і ўсебаковы росквіт нацыян[альнай куль]туры.

Як зараз, устаюць карц[іны] радасці і лікавання, якія м[ы...] чыць у Крэмлі па пасяджэ[нні] пага Надзвычайнага VI[II] з'езда Советаў, які прыня[ў Кан]стытуцыю СССР — н[...] перамогі бальшавіцкай [партыі і] совецкага народа. Я [...] цы беларускага народа, [...] мо беларускага народа вялікаму — тварцу адноўленага жыцця в[ызва]ленай зямлі, тварцу самай дэма[кратычнай] у свеце Канстытуцыі, якая [...] шчасце свабоднай пр[ацы,] жыццё для народаў.

Сталінская Канст[ытуцыя —] самае яркае сведчанн[е жыццёз]дольнасці і непераможнасці [соцыяліс]тычнай рэвалюцыі, [справы Маркса —] Энгельса — Леніна — [Сталіна.]

Л. АЛЕК[САНДРОЎСКАЯ.]
Народная [...]

Дэпутат—слуга на[рода]

Дэпутат — слуга народа. Гэта класічнае сталінскае вызначэнне ролі выбранніка народа ў Совет акрэслівае і ганаровую сутнасць яго дзейнасці. Вялікае шчасце атрымаць вышэйшае давер'е народа, быць яго пасланнікам у органы Совецкай улады.

Год назад працоўныя сталіцы Совецкай Беларусі далі пачэсныя поўнамоцтвы дэпутатаў раду работнікаў мастацтваў — актораў, мастакоў, выбраўшы іх поруч з іншымі прадстаўнікамі совецкай інтэлігенцыі і стаханаўцамі прамысловасці ў гарадскі і раённыя Советы Мінска.

Я працую ў абароннай секцыі Мінскага гарадскога Совета дэпутатаў працоўных. Дарэчы, у гэтай секцыі я працаваў і ў мінулыя годы, будучы ў ранейшым складзе гарсовета. Работа ў абароннай секцыі стала для мяне надзвычай блізкай і дарагой. Мая дзейнасць, як дэпутата, накіравана на ўмацаванне абароннай магутнасці і гатоўнасці горада, на пашырэнне і ўздым абароннай работы ў калектывах нашых прадпрыемстваў.

Абарона бацькаўшчыны ёсць свяшчэнны абавязак кожнага грамадзяніна СССР,— гэтыя словы Сталінскай Канстытуцыі натхняюць кожнага совецкага патрыёта.

Я ўдзельнічаў у праверцы становішча абароннай работы на фабрыках «Кастрычнік», «Кім» і іншых, а таксама агульнай падрыхтаванасці горада да супроцьпаветранай і хімічнай абароны. Шмат пра[цы] [...] на падрыхтоўцы і правядзенню прызыва мала[дых у] Чырвоную Армі[ю...] заключэнню [...] спаборніцтва [...] супроцьпаве[транай...] між Мінска[...] дзе дэлегац[...] Мінска кара[...] дэлегацыі, [...] ны сцяг ле[...] Выпаўняў [...] мя ўсяго, у [...] працягу кал[...] скую камісі[ю...] Працоўнага [...] драмтэатра.

Дэпутацк[ая...] шырае непа[...] гэта ўзбага[...] і для творч[асці...] квітнеючае [...] натхняе мя[не...] галіне — [...] ленне таго, [...] патрэбна на[...] агульны пат[...] кіравана на [...] дзімы, і скла[...] совецкага ча[...]

Радасна [...] вялікай с[...] цам Ста[ліна...]

СЛУЖЭННЕ НАРОДУ

...чвала — паэт вялікай шчыра-
...чь яго слаўнага юбілея мне
...пышных фраз, проста і шчы-
...ь яму руку, як старэйшаму
... пажадаць яму далейшых по-
...казаць: — Дзякуй! Дзякуй, дз-
... Дамінікавіч, за ўсё тое вялікае
...е, што ты стварыў у беларус-
...атуры.

...кая літаратура ў першую чаргу
... нашым народным паэтам —
...пе і Якубу Коласу тым, што
...сла свой правінцыяльны ўзро-
... этнаграфічныя межы і займае
...снае месца сярод літаратур
...одаў вялікага Совецкага Саю-
..., больш маладога пакалення
... совецкіх пісьменнікаў. Янка
... заўсёды жывым прыкладам
... сур'ёзнасцю і любоўю паві-
...а пісьменнік да сваёй пра-
... што нас захапляе і вабіць
...нкі Купалы, гэта глыбокае
...кая страснасць, з якой ...э-
...казана. Гэта пачуццё і гэту
...а Купала заўсёды чэрпаў і
... сваёй вялікай любві да
...ода. Ідэя ўсёй творчасці
... ідэя служэння народу. Не
..., якія той ці іншы паэт
...народу, а служэнне ў поў-
... сэнсе гэтага слова, калі
...душой за лёс свайго народа.
...дае народу ўсе свае сілы і
... талент. Ды і сам талент гэты
...з любві да народа. Адымі ў
такога паэта гэту любоў — і ён перастане быць паэтам.

Янка Купала з надзвычайнай яскравасцю і пераканальнасцю паказаў працоўнага чалавека, у першую чаргу беларускага селяніна-бедняка, яму самому. Паэт паказаў яму яго вузкую палоску, яго лапці і падрапаную світку, яго трухлявую падслепаватую хацінку і цёмнае, беспрасветнае, бяспраўнае жыццё. Ён сваімі творамі вучыў абурацца і ненавідзець тое, што не варта чалавечай годнасці і чаго чалавек не павінен цярпець. Яго творы ўзнімалі ў працоўнага чалавека павагу да самога сябе і да сваёй працы і заклікалі працоўныя масы змагацца за сваю чалавечую годнасць, за права «людзьмі звацца». І гэты заклік не заставаўся без водгуку.

І сёння, як і ў пачатку сваёй літаратурнай дзейнасці, Янка Купала застаецца верным сваёй ідэі служэння працоўнаму народу. Ён жыве творчымі поспехамі народа і радуецца яго радасцямі. У сённяшняй совецкай рэчаіснасці ён чэрпае новыя сілы, знаходзіць новыя паэтычныя фарбы і складае новыя выдатныя песні на славу свайго народа, сваёй вялікай радзімы і любімага правадыра. Толькі творчасць Янкі Купалы з'яўляецца цяпер здабыткам не аднаго беларускага народа, а ўсіх народаў вялікага Совецкага Саюза, і ад гэтага значэнне яго творчасці ўзрасло ў шмат разоў.

Пажадаем-жа нашаму юбіляру жыць і тварыць доўгія годы, а беларускай совецкай літаратуры — узбагаціцца новымі выдатнымі творамі Янкі Купалы.

К. КРАПІВА.

Івану Дамінікавічу Купале

...ыя «Литературной газеты» сар-
...шуе выдатнага песняра беларус-
...рода Янку Купалу ў дзень яго
... юбілея Вам прыйшлося перажыць
...ды прыгнечання таленавітага бе-
...а народа. Вам выпала шчасце
... з гэтым народам 23-гадовы
... будаўніцтва шчаслівага сацыялі-
стычнага жыцця. Вы ўбачылі з'яднанне гвалтоўна раз'яднаных абласцей Беларусі.

Багатае, цікавае жыццё Вы пражылі, і песні Вашы ўсё больш і больш цэніць совецкая зямля.

Рэдакцыйная калегія «Литературной газеты».

Масква.

Мінск, Саюзу совецкіх пісьменнікаў БССР

...да віншуем дарагога Янку Купа-
...годдзем літаратурнай дзейнасці.
... яму творчых перамог яшчэ на
...оды.
... Коласа і ўсіх беларускіх пісьмен-
нікаў віншуем са слаўным літаратурным імяніннікам.

Дзяржлітвыдат: Чагін, Еўгенаў.

Масква.

Дарагі Іван Дамінікавіч!

...лектыў супрацоўнікаў дзяржаўнага
...зецтва пры СНК БССР горача вітае
... вялікага Баяна беларускага народа,
... 35-годдзем Вашай літаратурнай дзей-
...сці.

За прамінуўшы час Вы шмат зрабілі
...я сваёй краіны. У дні першай рускай
...волюцыі у годы чорнай рэакцыі Вашы
...ы заклікалі беларускі народ на ба-
...бу з царска-памешчыцкім ладам, на
...ацьбу за новую, светлую будучыню.
...ж гэта радаснае жыццё, аб якім Вы
...ці і змагаліся зброяй ма-
...ыле завяявана. Вы сва-
ёй літаратурнай творчасцю актыўна ўключыліся ў соцыялістычнае будаўніцтва, прысвяцілі яму самыя лепшыя свае песні, сталі любімым паэтам усіх народаў нашай квітнеючай радзімы.

Жадаем Вам, Іван Дамінікавіч, многіх год жыцця і плённай творчай працы на карысць совецкай краіны і яе геройчнага народа. Спадзяёмся, што Вы, дарагі Іван Дамінікавіч, напішаце яшчэ многа вершаў і паэм аб нашым шчаслівым сёння, якія дапамогуць выхаванню працоўных у духу комунізма.

Рэпінскі, Казюк, Цырлін, Галодка.

Янку Купале

...а справах мастацтваў пры
...шуе з 35-гадовым юбілеем
...асці народнага паэта БССР

... — адзін з асноваположні-
... совецкай паэзіі. Які даў
...ду яркія, насычаныя
... закліку да барацьбы і
...а комуністычнага грамад-
...я нянавісцю да ворагаў і
поўныя бязмежнай любові і адданасці да правадыра і вызваліцеля беларускага народа, тварца беларускай дзяржаўнасці таварыша Сталіна.

Жадаем слаўнаму юбіляру многіх год плодатворнай дзейнасці на карысць беларускага нацыянальнага па форме і соцыялістычнага па зместу мастацтва.

Озірскі, Дадзіомава, Ліберзон.


...ароднаму паэту Янку Купале

...х кампазітараў БССР шле
...н Дамінікавіч, сардэчнае,
...чне ў дзень 35-годдзя
... літаратурнай творчай

...слова, дастойнае вялі-
... многа разоў натхня-
ла нашых кампазітараў і спрыяла ўзнікненню новых музычных твораў.

Шчыра жадаем Вам далейшых творчых перамог на карысць нашай вялікай соцыялістычнай радзімы.

Аргкамітэт Саюза совецкіх кампазітараў БССР.



Янка Купала ў дамашняй абстаноўцы.
Фота І. Каплінскага.

Песняру Беларусі — Янку Купале

У дзень Вашага слаўнага творчага юбілея, 35-годдзя служэння народам неабсяжнай радзімы, шлём Вам шчырае душэўнае прывітанне.

Вашы вершы і песні натхнялі народ у яго імкненнях да лепшага жыцця. Вашы песні былі на вуснах байцоў у часе вызваленчага паходу ў Заходнюю Беларусь. Вашы вершы клікалі да светлага, шчаслівага жыцця пад сонцам Сталінскай Канстытуцыі.

Мы ганарымся сваім сучаснікам, цудоўным чалавекам, таленавітым паэтам слаўнай сталінскай эпохі.

Жадаем Вам многа год жыць і тварыць на радасць і карысць народаў совецкай радзімы.

Прэзідыум Саюза пісьменнікаў Кіргізіі.

гор. Фрунзе.

Дарагі Іван Дамінікавіч!

Ад шчырага сэрца вітаю Вас з 35-гадовым юбілеем Вашай слаўнай літаратурнай дзейнасці.

Для нас, для маладшага пакалення паэтаў Совецкай Беларусі, Ваша мінулая творчасць была не толькі яркай карцінай жыцця і змагання нашага народа, не толькі баявым заклікам да барацьбы і свабоды, яна была для нас і непараўнальным узорам паэзіі, паводле каторай мы вучыліся пісаць.

Ваша сучасная творчасць з'яўляецца для нас прыкладам баявой палітычнай паэзіі, глыбокай і шчырай, мудрай і простай, так як уся Ваша дзейнасць з'яўляецца для нас прыкладам беззаветнага служэння свайму народу, прыкладам высокагамадзянскай любасці да нашай вялікай бацькаўшчыны—Саюза Совецкіх Соцыялістычных Рэспублік.

Жадаю Вам доўгіх і шчаслівых год жыцця, добрага здароўя і натхнёнай працы на карысць нашай радзімы і на славу нашага народа.

Пятро ГЛЕБКА.

СЛАЎНЫ ШЛЯХ

Я. КОЛАС

Трыццаць пяць год назад у мінскай рускай газеце «Северо-западный край» з'явіўся верш Янкі Купалы «Мужык». Верш быў надрукаван на беларускай мове. Заканчваецца ён наступнай страфой:

І кожны, хто мяне спытае,
Пачуе толькі адзін крык:
Што хоць мной кожны пагарджае,
Я буду жыць! — бо я мужык!

Гэты верш і кладзе пачатак літаратурнай дзейнасці народнага паэта БССР Я. Купалы. У адным з ранніх зборнікаў вершаў Я. Купалы «Гусляр» змешчан верш «А хто там ідзе». Аляксей Максімавіч Горкі першы з рускіх пісьменнікаў звярнуў увагу на паэзію Я. Купалы і на яго паэтычнае дараванне. Ён пераклаў верш «А хто там ідзе» на рускую мову. Адзначаныя творы паміма сваіх мастацкіх вартасцей заслугоўваюць увагі яшчэ і таму, што іх можна разглядаць не толькі як эпіграфы, але і як праграму купалаўскай паэзіі дакастрычніцкага часу.

Якая-ж гэта праграма?

Перш за ўсё, трэба адзначыць, што паэзія Я. Купалы — гэта сапраўдны голас працоўнага беларускага народа, які шмат вякоў нёс на сваіх плячах бяспраўе, соцыяльнае і нацыянальнае прыгнечанне, народа, чыё імя вытручвалася з яго свядомасці.

Ад імя народа і голасам народа пытаецца Я. Купала:

А чаго-ж, чаго захацелася ім,
Пагарджаным век, ім, сляпым, глухім?

І адказвае:

Людзьмі звацца.

За інтарэсы працоўнага народа, за народнае права, за яго вызваленне ад адвечнай няволі, ад памешчыцкай кабалы і царскай сваволі ўзвышае свой голас, поўны гневу і высокага грамадзянскага пафасу, яго сапраўдны сын Я. Купала. Паэзія Я. Купалы — гэта крык пакутнай душы народа, гэта — крыштальная крыніца народных дум, пачуццяў і спадзяванняў, яго, быць можа, неасазнанае імкненне заняць «пачэснае месца ў сям'і народаў». У асобе Я. Купалы беларускі народ мае свайго яркага, самабытнага, рознабаковага песняра, найбольш поўна адлюстраваўшага ў мастацкім слове яго працоўнае жыццё з усім смуткам і радасцямі, горасцямі і надзеямі і паклаўшага моцную аснову для беларускай літаратурнай мовы. Аглядаючы свой пройдзены шлях паэта-грамадзяніна, паэта-барацьбіта за народную справу, сёння Я. Купала можа падзяліць радасць свайго народа, бо ён, гэты народ, сапраўды заняў пачэснае месца ў сям'і народаў, стаў роўным паміж роўнымі, набыў сваю незалежнасць і сваю дзяржаўнасць. Вось чаму сёння Я. Купала складае свае лепшыя песні, поўныя сонечнай цеплыні і яркасці, новаму чалавеку, чалавеку соцыялістычнага грамадства, непераможнай партыі большэвікоў і другу прыгнечанага чалавецтва, правадыру і настаўніку, геніяльнаму Сталіну.

Паэзія Я. Купалы неадрыўна звязана з народам і сваімі каранямі ўрастае ў народную глебу. У сваім вершы «Мая навука» Я. Купала гаворыць:

Мне мудрасці кніжнай не даў бог
пазнаці,
Мой бацька не мог даць раскошаў
такіх, —
Навучыўся я слоў беларускіх ад маці
І дум беларускіх без школы і кніг.
Ад самай красы маіх дзён невясёлых
Настаўнікам быў беларускі абшар;
Усходы палеткаў і гоманы ў сёлах
Навуку сваю мне прыносілі ў дар.

Гэта непарыўная, арганічная сувязь Я. Купалы з родным народам дае сілу і поўнакроўны пульс яго творчасці. Я. Купала па-майстэрску выкарыстоўвае народную творчасць. Народныя легенды і паданні з'яўляюцца для яго тэмамі для цудоўных вершаў і паэм. Крылатае народнае слова ён умела ўплятае ў паэтычную тканіну сваіх твораў.

У паэзіі Я. Купалы можна сустрэць матывы шэўчэнкаўскай лірыкі. Несумненна, уплыў вялікага украінскага кабзара сказваецца на паэзіі Я. Купалы. У яго паэзіі мы знойдзем і элементы некрасаўскай грамадзянскай лірыкі. Можна нават сцвярджаць, што манера, пабудовы песень у Я. Купалы зближае яго з Беранжэ, і тым не менш Я. Купала застаецца зусім арыгінальным і своеасаблівым паэтам. Ён вялікі майстар верша. Яго вершы, поўныя хвалюючай цеплыні, выразны, поўнагучны, багаты ўнутранымі рыфмамі, асанансамі, алітэрацыямі і вельмі музыкальны. Яны лёгка ўспрымаюцца масамі. Я. Купала вядом далёка за межамі роднай Беларусі. Яго песні спяваюць на шырокіх прасторах неабсяжнай совецкай зямлі. Яго вершы «Хлопчык і лётчык», «Алеся», «Выпраўляла маці сына» і шмат іншых сталі папулярнымі сярод шматмільённых мас чытачоў нашага вялікага Саюза.

Я. Купала стварыў цудоўныя ўзоры песень, якія можна ставіць у адзін рад з лепшымі ўзорамі сусветнай паэзіі. У Я. Купалы ёсць рэчы, якія глыбока хвалююць, робяць моцнае ўражанне, праз якія нельга прайсці абыякава. Я не магу адмовіць сабе ў прыемнасці прывесці цалкам адзін верш Я. Купалы, напісаны ў форме санета яшчэ ў 1909 годзе. Называецца ён «Жніво».

Наспелая постаць шчаслівых пасеваў
За вёскай на сонным лясоў рубяжы,
Ссівелы ўжо колас схінула к мяжы
У сумным шаптанні: «Дзе, жнеі мае,
вы?»

І жнеі сышліся. — Направа, налева
Кладучы ў снапы каласы-старажы,
Зашасталі глуха сярпы, як нажы,
Пад жніўныя вечна старыя напевы.
Спагадная-нудная песня плыве,
Губляючы ў пушчы свае пералівы,
У шалестах белага коласу нівы.
Плыве гэта песня ка мне і заве,
І ў сэрцы звініць, як каса ў траве:
«Ты так-жа, брат, сееш... а дзе твае
жніва?».

Але творчасць Я. Купалы далёка не вычэрпваецца лірыкай. У яго ёсць нямала і драматычных твораў: камедыя «Паўлінка», драматычная паэма «Сон на кургане», сатырычная камедыя «Тутэйшыя» і інш. Яны мала даследаваны крытыкай, таксама як зусім не вывучан і фармальны бок творчасці Я. Купалы. Можна толькі пашкадаваць, што Я. Купала абарваў сваю работу ў галіне драматычнага мастацтва, бо ёсць падставы меркаваць, што і ў гэтай галіне ён даў-бы такія-ж высокія ўзоры, якія ён даў у лірыцы. Апрача таго Я. Купала шмат займаўся перакладамі. Ён даў цудоўны пераклад «Слова аб палку Ігаравым». Ім перакладзен «Медны коннік» А. Пушкіна, «Гайдамакі» Т. Шэўчэнкі і цэлы рад яго лірычных твораў, а таксама зроблена нямала перакладаў з Адама Міцкевіча, Марыі Канапніцкай і іншых польскіх паэтаў.

Сваю невялікую, агульнага характару заметку аб паэзіі Янкі Купалы, як маё шчырае прывітанне паэту ў дні юбілея яго трыццаціпяцігадовай творчай дзейнасці, я хачу закончыць словамі:

Мінуліся ночы, імгла,
І сум былы змоўк.
Другая дарога лягла,
Як золак, як шоўк.
Зірні-ж на яе — шырыня,
Бясконцы блакіт...
Сядлай-жа ў дарогу каня,
Дзе меч твой і шчыт?

СЛОВА АБ ЮБІЛЯРУ

М. ІСАКОЎСКІ

У сваім вершы «Мая навука» Янка Купала некалі пісаў:

Мне мудрасці кніжнай не даў бог пазнаці,
Мой бацька не мог даць раскошаў такіх, —
Навучыўся я слоў беларускіх ад маці
І дум беларускіх без школы і кніг.
Ад самай красы маіх дзён невясёлых
Настаўнікам быў беларускі абшар;
Усходы палеткаў і гоманы ў сёлах
Навуку сваю мне прыносілі ў дар.

У гэтым вершы, як і ў многіх іншых, выражана тая нязменная сувязь з народам, якая заўсёды была ў паэта, якая і зараз застаецца такой-жа моцнай і глыбокай, як і раней.

Паэзія Я. Купалы—гэта не проста добрыя высокамастацкія вершы. Гэта—апрача ўсяго—своеасаблівая гісторыя жыцця беларускага народа з яго нравамі і звычаямі, з яго думамі і спадзяваннямі, з яго барацьбой і перамогай. І калі я ўпершыню ўзяў у рукі кнігі Я. Купалы, дык мяне ўразілі не толькі незабыўныя страфы паэта, але і тая акалічнасць, што я, нібы ўвачавідкі, убачыў жывую Беларусь — яе раўніны і ўзгоркі, яе лугі і пералескі, рэкі і азёры. Я глыбей зразумеў жыццё працавітага і геройчнага беларускага народа. Я ўсёй душой палюбіў Беларусь, хоць ні разу там не быў раней.

І з таго часу, калі я думаю аб Беларусі, мне мімаволі ўспамінаецца Я. Купала і, наадварот, калі я чытаю вершы Я. Купалы, дык нібы бачу ўсю Беларусь з яе цяжкім мінулым і шчаслівым сёння.

Як проста і, разам з тым, як ярка і пераканаўча пісаў паэт аб жыцці прыгнечанага беларускага селяніна:

За сахой, баранай,
За сярпом і касой
З дня на дзень, з году ў год
Слёзы, пот лье народ,
А за гэта, за ўсё
Што-ж здабыў за жыццё?
Гэй, го-го! Гэй, го-го!
Мы жывём і пяём,
Хлеб наш людзі ядуць,
Мы-ж мякіну жуём!..

І яшчэ:

Смерць таму, хто хлеб астатні
З бедных выдзірае!
Смерць таму, хто на люд братні
Кайданы ўздзявае!

Патрэбна была сапраўды вялікая любоў да народа і вялікая мужнасць, каб пісаць такія вершы ва ўмовах царскага самаўладства. І Я. Купала пісаў іх. І іх немагчыма было забыць. Яны не маглі не хваляваць людскія сэрцы, не маглі не клікаць на барацьбу з прыгнятальнікамі. І ў гэтым вялікая заслуга паэта.

А колькі цудоўных вершаў напісаў Янка Купала аб перамозе Кастрычніцкай рэволюцыі, аб годах соцыялістычнага будаўніцтва! З якой цеплынёй, з якой любоўю гаворыць ён аб людзях нашай эпохі — аб калгасніках, аб лётчыках, аб комсамольцах і аб тым, чыё імя стала нашым баявым сцягам, — аб таварышу Сталіне:

Як песня, жыве яго імя ў народзе,
У кожным зzарэнні, у кожнай прыгодзе,
Ці майскае свята ў жывым карагодзе,
Ці свята Кастрычніка ў хаты прыходзіць,
Як песня, жыве яго імя ў народзе.

Паэта, валодаючага такімі высокімі якасцямі, аддаўшага і аддаючага ўсе свае сілы, увесь свой вялікі і своеасаблівы талент на служэнне народу, нельга не любіць.

І у гэты дзень, калі Беларусь святкуе слаўны юбілей свайго славутага песняра, мне-б хацелася выразіць толькі адно жаданне: каб жыў ён доўгія, доўгія годы, працуючы на карысць роднай Беларусі і ўсяго совецкага народа.

Нізкі паклон табе, Іван Дамінікавіч, і самае сардэчнае дзякуй за ўсё, што ты зрабіў і зробіш у будучым.

С народом ты вырос, ты пел для народа,
И в сердце народное песня запала.
Живи ж и работай долгие годы,
Песняр Белоруссии—Янка Купала!

Масква.

В. БАРЫСЕНКА

...ка Купала

...ння ўрачыста і ра-
...дзе літаратурна-ма-
...й дзейнасці славутага
... — народнага паэта
... Сваім жыццём і рэ-
...цю Я. Купала непа-
...ам. Вылучаны на лі-
...ратычнымі сіламі
...акутваўшай пад
... Я. Купала на
...га жыццёвага і
...ым мастацкім
...агаўся і ад-

...рыю бела-
...як талена-
... народных
... як і ў
...аса, знай-
... свабода-
... яго на-
...йныя ім-
... і благарод-

... і Я. Колас
...ыя навата-
... літаратуру
...ымі праб-
...рад ёю по-
...надалі ёй
... вызначылі
...а і Я. Ко-
...ю сістэму
...ае мастац-
...ры і ўлас-

... упершыню
... купалаўскай
... і хвалюю-

... творчага
... паэт да-
...ра су-
... паэзію
...нты-
...ла ў
шматлікіх вершах («Да сваіх песень», «Да сваіх думак», «Я — не паэт», «Мая песня», «Ограведзь») указваў, што яго песня нарадзілася не ў пышных палацах, сярод золата і бляску, а ў курнай сялянскай хаце, у ліповай калысцы, на прыгнечанай зямлі. Апяваць «долю-нядолю» народа, сумленна служыць яму сваім мастацкім словам, заклікаць на барацьбу супроць прыгнятальнікаў і эксплаатата-раў, паказваць дарогу да соцыяльнай праўды — вось у чым бачыў Я. Купала глыбокі сэнс сваёй творчай работы, мэты і прызначэнне сапраўднай паэзіі.

Я. Купала стварыў у сваіх вершах («Толькі песняй», «Званар», «Курган») геройчны вобраз мастака з народа як непахіснага барацьбіта, які аддае народу кроў свайго сэрца і самыя лепшыя імкненні свайго розуму. У гэтых мастацкіх вобразах паэта-трыбуна многа істотных рысаў асобы іх стваральніка — самога Я. Купалы.

У адным з сваіх ранніх твораў Я. Купала скромна гаварыў пра сябе:

Кожны край мае тых, што апяваюць,
Чым ёсць для народа упадак і хвала,
А беларусы нікога-ж не маюць.
Няхай-жа хоць будзе Янка Купала.

І сапраўды, Я. Купала першы сапраўды нацыянальны і сапраўды народны беларускі паэт. Яго паэзія — гэта мастацкая гісторыя жыцця беларускага народа на пэўным этапе яго развіцця. Са старонак лірычных, эпічных і драматычных твораў Я. Купалы ўстаюць перад нашымі вачыма рэалістычныя карціны беларускага жыцця ў яго мінулым і сучасным, вобразы беларускага народа і роднай старонкі, выдатна намаляваныя чароўныя карціны беларускай прыроды з яе шумлівымі лясамі, квітнеючымі пахучымі лугамі, маўклівымі балотамі, поўнаводнымі рэчкамі і то ясным, то малочна-туманным неба...

Я. Купала ва ўсіх падрабязнас...
даў, адчуваў і разумеў шмат...
жыццё сумленных, але абяздоленых людзей. Падобна Шэўчэнку і Некрасаву, следуючы за імі і развіваючы іх рэволюцыйна-рэалістычныя традыцыі, Я. Купала ў сваіх дакастрычніцкіх творах малюе цяжкое жыццё роднага яму народа і яго геройчна-вызваленчую барацьбу за сваё разняволенне.

Супроцьстаўленне жыцця, быту, адчуванняў і поглядаў прыгнечаных людзей жыццю і светаадчуванню грамадскіх «вярхоў» — пануючых класаў — чырвонай ніткай праходзіць праз усю творчасць паэта дакастрычніцкай пары. Я. Купала стварыў патрасаючыя карціны жыцця абяздоленых працоўных беларусаў, якія былі асуджаны самаўладствам і капіталізмам на выміранне, пакуты і гора, голад і холад, невуцтва і палітычнае бяспраўе.

У творах «Я мужык-беларус», «Град», «З песень беларускага мужыка», «Спрасоння», «Зімой», «Ах, ці доўга», «Для куска хлеба» і іншых паэт малюе трагічныя вобразы замучаных непасільнай працай і эксплаатацыяй, прыніжаных і пагарджаных людзей. Я. Купала з горыччу апавядае ў сваіх песнях аб тым, як калечыць і атручвае жыццё працоўнага чалавека паразітычнае эксплаататарскае грамадства, адымаючы ў яго ўсе радасці. У гэтых вершах чуецца боль паэта-гуманіста за растаптанае самаўладствам чалавечае дастоінства, за паруганую чэсць благародных людзей курных хат.

Лірычны герой Я. Купалы, углядаючыся ў сваю горкую долю, бачыў у ёй скрозь «...крыжы... карчмы... астрогі...» як сімвал пакут і цемры, страшнага прыгнечання, зла і насілля:

Карчмы ды астрогі,
Крыжыкі, бярозкі, —
Гэта наша доля,
Доля нашай вёскі.

Апавядаючы ў сваіх вершах і паэмах аб жыцці прыгнечанай краіны і яе людзях, Я. Купала не толькі разам з імі, як іх лепшы друг і мастацкі выязвіцель, аплакаў іх «долю-нядолю», але і ўславіў, апеў іх самаафярны герайзм у барацьбе за сваё разняволенне і свабоду радзімы, выявіў іх рэволюцыйную страсць і веру ў перамогу над сваімі шматлікімі ворагамі. ...людзях працы Я. Купала бачыў са...чых невыбітаў гуманнасці і чалавечнасці, стваральнікаў духоўных і матэрыяльных каштоўнасцей, невычарпальную крыніцу мужнасці і геразму, мудрасці і благародства, усяго ўзвышанага і прыгожага.

У вядомым творы «А хто там ідзе», аб якім А. М. Горкі даў высокі водгук, Я. Купала намаляваў незабыўны, вялікага соцыяльнага гучання вобраз галоднай працоўнай Беларусі, якая падымаецца на барацьбу за свае правы, за волю, за шчасце.

А хто гэта іх, не адзін мільён,
Крыўду несць навучыў, разбудзіў іх сон?
Бяда, гора.
А чаго-ж, чаго захацелася ім,
Пагарджаным век, ім, сляпым, глухім?
Людзьмі звацца.

Паказу самаафярнай барацьбы працоўных мас і вобразаў «ваякаў за долю, волю і народ» Я. Купала прысвяціў свае самыя значныя і самыя прыгожыя творы. Яны прасякнуты страсным жаданнем паэта бачыць народ свой вольным, напоўнены прадчуваннем і чаканнем наступлення рэволюцыйнай буры і гарачай упэўненасцю ва ўрачыстасці соцыяльнай праўды, якую сцвярджаў народ.

У дакастрычніцкай творчасці Я. Купалы знайшлі сваё мастацкае адлюстраванне супярэчлівасць, своеасаблівасць і характэрныя рысы развіцця нацыянальна-вызваленчага руху ва ўмовах Беларусі пачатку XX стагоддзя і ідэйна-палітычны рост працоўных мас прыгнечанай краіны.

Муза Я. Купалы ўзмужнела ў агні класавай барацьбы працоўных мас супроць нянавіснага самаўладства і «цара капітала». Пры наяўнасці супярэчнасцей, абумоўленых канкрэтнымі соцыяльна-гістарычнымі ўмовамі эпохі, творчасць Я. Купалы, прасякнутая жыццёсцвярджальным светапоглядам і ідэямі рэволюцыйна-вызваленчай барацьбы, з'яўлялася магутнай зброяй у руках народа у барацьбе супроць «сваіх» і «чужых» прыгнятальнікаў.

Асабліва шырока разгарнуліся творчыя сілы Я. Купалы ва ўмовах совецкай рэчаіснасці. Перамогшы часовыя ідэйныя заблуджэнні, характэрныя для яго творчасці першых год соцыялістычнай рэволюцыі, Я. Купала выйшаў на шырокую дарогу соцыялістычнай літаратуры, заняўшы ў ёй адно з першых і пачэсных месц.

За годы Совецкай улады ў творчасці Я. Купалы адбыліся вялікія і станоўчыя якасныя змены. Значна пашырыўся ідэйна-тэматычны дыяпазон купалаўскай паэзіі, яна ўзбагацілася новымі вобразамі, матывамі і лірычнымі жанрамі. Творчасць Я. Купалы нашых дзён сведчыць аб новай якасці рэалізма Я. Купалы, як прадстаўніка соцыялістычнай літаратуры.

Сучасныя песні Я. Купалы авеяны рэволюцыйным пафасам, прасякнуты духам совецкага патрыятызму, напоўнены пачуццём гарачай любві і адданасці комуністычнай партыі і соцыялістычнай радзіме. Яны адлюстроўваюць у сабе веліч сталінскай эпохі, грандыёзнасць геройчных спраў соцыялістычнага чалавека.

Надоўга западаюць у памяць чытача лірычныя вобразы совецкага чалавека і геройчнага совецкага народа, створаныя майстэрскай рукой выдатнага пісьменніка ў яго творах «Дзве сястры», «Алесь», «Госці», «Сыходзіш, вёска, з яснай явы», «Сталінскія арляняты», «Беларусі ордэнаноснай», «Табе, правадыр» і інш. Я. Купала красачна і з любоўю малюе вобразы соцыялістычнай Беларусі, творчую і мужную працу совецкага чалавека, яго благародны духоўны воблік, заможны новы быт, соцыялістычныя адносіны, карціны беларускай прыроды, героіку нашых рэволюцыйных будняў.

Глядзяць мае вочы і вокала бачаць,
Як дзіва за дзівам ідзем ў нашы хаты,
І слухаюць вушы гул песень юначых
І цешыцца сэрца з вялікага свята —

з радасцю адзначае паэт.

Раданымі песнямі вітаў народны паэт вялікае вызваленне народаў Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны ад белананскага гнёту. У цыкле твораў «На заходнебеларускія матывы» Я. Купала дастаткова поўна паказаў цяжкое жыццё заходніх беларусаў пад гнётам панаў і шляхты і выявіў радасць вызваленых ад соцыяльнага і нацыянальнага прыгнёту народаў Заходняй Беларусі.

Росквіт і бурны рост Совецкай Беларусі, поўнакроўнае і шчаслівае жыццё беларускага народа паэт звязвае з геніем вялікага Сталіна. Да яго, лепшага друга беларускага народа, вялікага правадыра працоўных усяго свету, паэт накіроўвае свае шчырыя думы і пачуцці, гарачую любоў і ўдзячнасць:

Мы ідзем у сонца з сонцам
Маладым паходам.
Слава бацькаўшчыне нашай
І яе народам.
Слава сокалу, што родам
З-пад каўказскіх скалаў,
Што з Крамля праменні сее
З юнацкім запалам.

Ідэйная змястоўнасць, жыццёвая мастацкая праўдзівасць, свежасць і арыгінальнасць паэтычных вобразаў, багацце мовы, даходчывасць да мас,—гэткія найбольш істотныя асаблівасці соцыялістычнай лірыкі Я. Купалы.

Песні Я. Купалы натхняюць у барацьбе за соцыялізм, выхоўваюць высокае пачуццё совецкага патрыятызму, нянавісць да ворагаў народа і з'яўляюцца крыніцай высокай эстэтычнай асалоды.

Вялікі рускі пісьменнік, асноваположнік соцыялістычнай літаратуры А. М. Горкі з захапленнем гаварыў аб паэзіі Я. Купалы. У сваіх пісьмах і выказваннях Аляксей Максімавіч даў бліскучую характарыстыку творчасці Я. Купалы і вызначыў яго месца і значэнне ў літаратуры народаў СССР. Трыццаць год назад, у 1910 годзе ў адным з сваіх пісьмаў да украінскага пісьменніка Кацюбінскага А. М. Горкі з нагоды творчасці Я. Купалы і Я. Коласа заўважае: «У Беларусі ёсць два паэты— Якуб Колас і Янка Купала, вельмі цікавыя рэбяты. Так прымітыўна проста пішуць, так ласкава, сумна, шчыра. Нашым-бы крыху гэтых якасцей. О госпадзі, вось-бы добра было».

У 1935 годзе, у дзень 30-гадовага юбілея літаратурнай дзейнасці Я. Купалы А. М. Горкі прыслаў народнаму паэту лаканічнае, але хвалюючае прывітанне, у якім змяшчаецца высокая ацэнка мастацка-літаратурнай дзейнасці Я. Купалы, як «пястомнага паэта-рэволюцыянера».

Я. Купала — любімы паэт Совецкага Саюза. Яго творы чытаюць, ведаюць і любяць мільёны совецкіх людзей розных нацыянальнасцей і народнасцей, бо яны блізкі і зразумелы ім, бо ... народныя па сваёй фо... і па свай ...

АД СЭРЦА

★

А. КУЧАР

★

Увесь 35-гадовы літаратурны шлях Янкі Купалы быў цесна звязан з беларускім народам, з яго лёсам, з яго рэвалюцыйным змаганнем. Творчасць паэта нельга зразумець, не ўлічваючы гэтай арганічнай сувязі яе з народам. Нельга разабрацца ў сутнасці творчасці Я. Купалы, не разумеючы таго, што ўсё яго свядомае жыццё прайшло ў шуканні шчасця для народа.

Калі да Вялікай Кастрычніцкай соцыялістычнай рэвалюцыі голас Я. Купалы быў голасам народнага гора, гневу, пакут, дык у нашы дні вершы Я. Купалы ёсць голас народнай радасці. Творы паэта паказваюць новае аблічча нашага народа, яркія старонкі яго жыцця пад сонцам Сталінскай Канстытуцыі.

Я. Купала змог стаць сапраўды соцыялістычным лірыкам, застаючыся адначасова як паэт, як майстар, самім сабою, г. зн. не страціў сваёй паэтычнай сілы і застаўся гранічна шчырым. Лепшыя творы Я. Купалы апошніх часоў: «Аб Сталіне сейбіту», «Табе, правадыр», «Выбары», «Лён», «Як прыехаў сын у госці», «Сыны», «Хлопчык і лётчык», «Алеся», «Беларусі ордэнаноснай», «Партызаны», «На заходне-беларускія матывы»—з'яўляюцца аднача́сова лепшымі творамі беларускай совецкай паэзіі.

Ва ўсёй паэзіі Я. Купалы мы пазнаем уласцівую яму адпаму манеру пісьма, яго падыход да рэчаіснасці. Усюды паэт бытуе са сваімі пачуццямі, са сваімі спецыфічнымі адносінамі да рэчаіснасці.

Што прывяло Я. Купалу на соцыялістычныя пазіцыі, што зрабіла яго соцыялістычным лірыкам?

Увесь дарэволюцыйны пакутны шлях Я. Купалы, як паэта, прывёў яго лагічна да соцыялістычных пазіцый. Калі не даць новую песню пра былога гарапашнага пакутніка зямлі, а цяпер вольнага працаўніка на соцыялістычных палях, то Я. Купале не было-б чаго сказаць у літаратуры. І Я. Купала гэтае новае слова пра соцыялістычнага чалавека сказаў, і сказаў у вельмі моцнай форме.

Такім чынам, любоў да радзімы, агідная нянавісць да ворагаў радзімы, вялікая шчырасць, адданасць справе Леніна—Сталіна з'явіліся прадумовамі паэтычнага ўзлёту, паэтычных поспехаў Я. Купалы.

Я. Купала несупынна шукае новыя вобразы—яркія, меладычныя, па-народнаму глыбокія. Яму належыць рад цудоўных песень пра таварыша Сталіна, якога ён назваў «вялікім сейбітам». Вобраз Сталіна мы часта знаходзім у паэзіі Я. Купалы.

Пачуццё вялікага пафасу, вялікая страсць, павінна быць у мастацкім творы. Гэта страсць, пачуццё пафасу прысутнічае ў творчасці Я. Купалы. Верш паэта —гэта імклівасць, палёт, вялікае пачуццё, сіла, натхненне. Усюды ў творах Я. Купалы прысутнічае не толькі трапна і ў яркай форме выказаная думка, але і глыбокі паэтычны пафас, г. зн., што паэт усёй сваёй істотай, усімі сваімі думкамі і пачуццямі зліт з аб'ектам сваёй паэзіі, горача і глыбока перажывае тое, пра што піша.

Любімым прыёмам Я. Купалы з'яўляецца пераўвасабленне ў свайм героі, ад імя якога ён і вядзе апавяданне,—ці то гэта лётчык, ці дзяўчына Алеся, ці дзіця, якое хоча прамяцець пад Крэмлем і крыкнуць «Дзень добры, таварыш наш Сталін!»

Прастата Я. Купалы ідзе ад выкарыстання фальклору, народнай творчасці, але гэта іменна такая прастата, якой здзіўляешся: так проста і паэтычна! Гэта якасць ідзе ад спалучання фальклору з паэтычнай культурай.

Я. Купала піша пра выбары ў Вярхоўны Совет. Пачынае ён верш надзвычай прачулымі і простымі радкамі:

Засядзе народ у Крэмлі
Кліч кінуць на цэлы бел-свет,
Пацвердзіць для роднай зямлі
Свой Сталінскі вечны завет.

Іменна так мы і асэнсоўваем пасяджэнне Соцыялістычнага парламента, куды прыходзіць просты чалавек і, па-праву заняўшы пачэснае месца, вырашае вялікія дзяржаўныя справы. Возьмем другі прыклад з вядомага верша Я. Купалы «Як у госці сын прыехаў»:

Як у госці сын прыехаў —
А да маці, а не з блізка, —
Яе шчасце, яе ўцеха,
Ад пялёнак, ад калыскі...

. . . .

І цікавілася маці, —
Сэрца матчына вядома, —
Як на службе там дзіцяці,
Ці там лепей, ці мо' дома?

Гэта сапраўдны народны верш. Як адказвае сын? «Дома добра, ...там не горай, мо' й лепей»

Адказ сына напісан у адпаведнасці з фальклорнай традыцыяй, і ён такі праўдзівы таму, што паэт глыбока ведае жыццё. Нашы жанчыны—гэта новыя людзі, пра Чырвоную Армію яны добра ведаюць, кожная з іх лічыць за шчасце паслаць свайго сына ў Чырвоную Армію, але маці ёсць усё-ж маці. І гэта вельмі трапна выказаў Я. Купала ў радках: «Як на службе там дзіцяці?»... Гэта «дзіця», можа, праляцела тысячы кілометраў на самалёце, зрабіла гераічны подвіг, але для мацеры яно «дзіця».

Паэзія Я. Купалы пераважна гутарковай інтанацыі, аратарскага складу. Прадумовы для яе разумення трэба шукаць у «Слове аб палку Ігаравым». Уласна кажучы, голас не аратара, а баяна, вешчуна, народнага песняра адчуваем мы ўсюды ў творчасці Я. Купалы. Нездарма Я. Купала амаль цэлых 10 год працаваў над «Словам аб палку Ігаравым».

Мастацтвам можа стаць звычайнае «простае» слова, калі яно набыло новае сэнсавае гучанне, бо паэзія заключаецца не ў выкрутасах і пазёрстве, а ў пачуцці, якім авеян твор. Але гэта не азначае, што трэба адмовіцца ад пошукаў новых вобразаў. Аказваецца, помнікі нашай літаратуры накшталт «Слова аб палку Ігаравым» паказваюць, што паэты старажытнасці стваралі незвычайна яркія эпітэты, метафары, параўнанні. У «Слову аб палку Ігаравым» шмат імклівых і смелых вобразаў.

Пошукі новага вобраза, выходзячы з таго прынцыпа, якім карыстаецца аўтар «Слова аб палку Ігаравым», мы і маем у Я. Купалы.

У вершы «Сыходзіш, вёска, з яснай явы» мы знаходзім такія незвычайныя радкі аб аратым новай вёскі: «Абцёршы сонцам воблік потны, пад крыж не пойдзе енчыць квола». Хоць тут няма простага падабенства да вобразаў з «Слова», але мы сцвярджаем, што такі вобраз мог нарадзіцца ў паэта, які выкарыстаў традыцыю вялікай старажытнай паэмы ў будаванні яркіх і незвычайных вобразаў.

Нярэдка сярод вобразаў Я. Купалы мы сустракаем такія, якія пабудаваны проста пад уплывам «Слова аб палку Ігаравым». Скажам, у «Слове» мы знаходзім вобраз «чорны гругане, паганы палаўчаніне», а ў Я. Купалы—«чорны груган збіраў белыя косці». У «Слове»: «чорная зямля пад капытамі касцьмі была пасеяна, а крывёю паліта». У Я. Купалы:

Балюе панская Варшава....
Жандарскі конь б'е капытамі,
Пад капытамі жудкай явай —
Людскія галавы пластамі.

Гэта сказана пра былую панскую Польшчу. Цэлая карціна ўстае перад намі з чатырох радкоў.

Характэрныя вобразы з «Слова» мы сустракаем у Я. Купалы вельмі часта «Ні мысляй памысліць, ні думай падумаць» (такі таўталагічны зварот—улюбёны прыём Я. Купалы); «і помсту лялеюць»; «раным-рана галосяць»; «на быстрага рынуў каня»; «груганы не закрумкалі»; «заснуў свергат салавейчы»; «на звычай і абычай» і т. д.

З работай над «Словам аб палку Ігаравым» звязана яшчэ адна асаблівасць у творчасці Я. Купалы. Гэта выключная суровасць яго радка. Калі Я. Купала газорыць аб поспехах нашай радзімы, дык ён не робіць установкі на сантыментальна-пачуццёвы эфект. Яго песні пра калгасны лад празрыстыя, ясныя, і ў гэтых песнях вы ніколі не знойдзеце сантыментальна-лёгкаважкага падыходу да рэчаіснасці.

Я. Купала—лірык па пераважнасці. Да эпічных карцін ён рэдка звяртаецца. Лірыка Я. Купалы суровая, рытмічна рознастайная, з многімі ўнутранымі рытмічнымі ходамі, з рытмічнымі перабоямі. Рэкат чуецца ў гэтых аднастайных, усё больш і больш нагнятаемых, рытмічна-нарастаючых радках:

Прыдзе новы—а мудры гісторык,
А ён прыдзе—ужо ён ідзе —
І сказ дзіўны, праўдзівы ад зорак
І да зорак аб нашых прасторах,
Аб падзеях, людзях павядзе.

Я. Купала любіць народныя звароты, фразы, мову. У тоне народнай песні вытрыманы «Лён», «Алеся», «Вечарынка». Я. Купала ўжывае таўталагічныя народныя звароты: «шчырыя шчырага сэрца парывы», «дзівам дзівіцца вялікаму цуду, што вакол мяне так цуднее ўрачыста», «дасяглі недасяглых пабед» і г. д.

Нешаблонныя, незвычайныя звароты вельмі часта ажыўляюць купалаўскі верш. У звычайны верш часам урываецца такая паэтычная страфа, якая ажыўляе ўвесь верш. Гэта таксама адна з асаблівасцей таленту Я. Купалы.

Я. Купала напісаў верш аб мінулым і сучасным Беларусі—«Беларусі ордэнаноснай». У гэтым вершы, у дачыненні да мінулага, сказана:

Цар, цараняты нагайкамі няньчылі.
Пан і паняты паслі бізунамі,
Турмамі песцілі, петлямі лашчылі,
Розгамі секлі, цямрылі багамі.

«Цараняты», якія «няньчаць нагайкамі» і «пасуць бізунамі», надаюць вершу незвычайны сарказм.

У гэтым-жа вершы ёсць вобраз: «скрыпнулі вісельні», «путы забразгалі». Якое гэта незвычайнае бачанне рэчаў! Сапраўды, вісельні ў царскі час былі такой звычайнай з'явай, што яны скрыпелі дамавіта, як вароты. Гэта паказвае на вялікае адчуванне паэтычнага слова ў Я. Купалы. Гэтыя вобразы надаюць жудасць вершу, з якога мінуўшчына ўстае як жывая.

Наогул, верш «Беларусі ордэнаноснай» —адзін з самых выдатных твораў Я. Купалы аб Беларусі. У гэтым вершы мы знаходзім цудоўныя песенныя строфы пра сучасную Беларусь:

У вадзіцы ў крынічнай
Чысценька памыйся,
Прыбярыся ў кветкі-краскі,
Сонцам атуліся.

Гэты вобраз не выпадковы для Я. Купалы. Ён паходзіць ад той Беларусі з верша «Маладая Беларусь», у якой «з свойскіх кветак-пралесак карона», а сама яна—«ясната лебядзіная!» Гэты вобраз нагадвае і верш «Безназоўнае»:

Беларусь на купе
Ў хаце сваёй села.
Чарка мёду ў руцэ,
Пазірае смела.

Часам адным яркім народным словам ажыўляе Я. Купала свой верш.

Весяліся, ганарыся,
Мой «Чырвоны аратаю».

Гэта аб калгасе. Паэт гаворыць не «аратай», а «аратаю». Так яно мілей і сардэчней гучыць. І гэта слова «аратаю» робіць нам калгас асабліва блізкім, родным.

Для таго, каб выразіць веліч нашай радзімы, спакойную ўпэўненасць яе людзей, Я. Купала піша:

І з'аралі сваю ніву
Шырака, глыбока,
Зерне ўкінулі шчасліва
Чыстае, як вока.

Тут нас здзіўляе незвычайнае веданне Я. Купалам народнай мовы, характару будовы фразы. «Зерне чыстае, як вока» —вобраз, роўны якому нельга знайсці ў другога беларускага паэта.

Нарэшце, яшчэ адзін выдатны прыклад, калі адна незвычайная дэталь ажыўляе верш, мы знаходзім у творы аб белапольскай акупацыі:

Пакідаў гняздо бусел,
Свае пожні і сосны,
Паляцеў, не вярнуўся
Ў тыя чорныя вёсны.

Паэт афарбоўвае верш у такія тоны, якія дапамагаюць яму ярчэй выразіць пакуты народа пад прыгнётам паноў. Раз бусел, які прывык спакон вякоў да аблюбаванага месца, не вярнуўся да яго, значыць усё знішчана, згарэла тое дрэва, на якім было гняздо. Вясну, якую мы прывыклі бачыць зялёнай, паэт называе тут «чорнай».

Такім чынам, Я Купалу вельмі добра вядом залаты закон, паводле якога паэзія ёсць адкрыццё ўсё новых і новых нязведаных шляхоў у будучыню.

Я. Купала не цураецца так-званых «грубых» зваротаў. Разуменне таго, што няма ў сапраўднага паэта падзелу на «ўзвышаныя» словы і выразы і на «звычайныя», «простыя» пранізвае ўсю творчасць Я. Купалы.

Гутарковая інтанацыя вельмі характэрна для творчасці Я. Купалы, і яна звязана з тым, што паэт часта зліваецца з аб'ектам сваёй паэзіі, адчувае сваю непасрэдную сувязь з ім:

Да нас госці ў госці едуць
З усёй кулі земскай,
І ўсе бачаць, што жывецца
Нам зусім не кепска.

А вось паэт гаворыць зусім задушэўна разам з хлопчыкам:

— Мой мілы таварыш, мой лётчык,
Вазьмі ты з сабою мяне.

Вершы пра дзяцей выдаюць у Я. Купале псіхолага тонкага знатака дзіцячай душы. У вершы «Хлопчык і лётчык» вельмі праўдзіва паказана, як дзіця імкнецца размаўляць па-даросламу. Верш пачынаецца працягам размовы, якая раней вялася паміж лётчыкам і хлопчыкам:

Мне ўжо надакучыла дома—
У дзіцячы хадзі адно сад,
А так паглядзеў-бы, вядома,
На іншы парадак і лад.

. . . .

Вось гэтак у добрым здароўі
Мы будзем ляцець і ляцець.
Вазьмі-ж мяне, лётчык, з сабою
Не будзеш ты клопату мець!

«А так пагдядзеў-бы, вядома», «у добрым здароўі», «не будзеш ты клопату мець»,—так гавораць дарослыя. І вось гэта імкненне дзяцей гаварыць па-даросламу надзвычай трапна выразіў Я. Купала.

У вершы, прысвечаным выбарам, дзяўчынка Галіна гаворыць: «Пайшлі ў госці мама, тата, голас свой панеслі». Такое рэчавае ўяўленне дзяцей аб «голасе» вельмі натуральнае і праўдзівае. Раз будуць канверты, бюлетэні, значыць, голас павінен уяўляцца нечым матэрыяльным, вось чаму «голас свой панеслі».

Асноўнейшая рыса творчасці Я. Купалы —гэта велізарная нянавісць да ворагаў, палымнеючае пачуццё нянавісці да іх. Я. Купала па-народнаму асэнсоўвае гэту нянавісць да ворага. І тут ён не здраджвае адменнаму падыходу да тэмы. Каб пасвойму, адменна выразіць нянавісць да ворагаў, Я. Купала звяртаецца да найбольш улюбёнай сваёй крыніцы, да народнай творчасці. З'яўляюцца наступныя радкі аб трацкісцка-бухарынскіх гадах:

Хай калом магіла
Для вас, злыдні, будзе,
Каб гэтай магілы
Цураліся людзі!
Каб гукалі совы
Па-над вамі, псамі,
Косці расцягалі
Груганы з ваўкамі!

Гэтая нянавісць да ворагаў, выражаная праз кляцьбу, характэрная рыса і многіх ранейшых твораў Я. Купалы.

Творчасць Я. Купалы совецкага перыяду вялікая і рознастайная. Творы паэта на сучасную тэму пра калгасную вёску значна ўзбагацілі совецкую літаратуру. Гэта творы сапраўднай паэзіі, у іх адчуваюцца спецыфічна-купалаўскія паэтычныя рысы. У гэтых творах мы бачым арганічнае зліццё паэта з новым ладам, які пабудаван вялікімі намаганнямі і гіганцкай працай нашага соцыялістычнага народа.

Творы Купалы напісаны ад сэрца.



Янка Купала ў сваім кабінеце.

Фота І. Капялянскага.

ПАЭТ І НАСТАЎНІК

★

М. ЛЫНЬКОЎ

★

Прывет вам, вольныя паэты,
Прывет вам ад душы ўсяе!
Хай вашы песні з лета ў лета
Зямля совецкая пяе!

. . . .

Прывет вам, вольныя паэты,
Народаў братніх дружны хор!
Хай прамянее агняцветам
Радзімы нашае прастор! —

гаварыў народны паэт Янка Купала, вітаючы ў 1936 годзе ўсесаюзны злёт паэтаў у сталіцы нашай рэспублікі. Ён вітаў песняроў братніх народаў як адзін са старэйшых паэтаў, як адзін з самых выдатных «людскіх душ слаўных майстраў». І ў сваім прывітанні ён запрашаў паэтаў несці «ленінскім заветам свой шчыры песень вашых дар!» Несці так, «каб праз вякі вясной распетай дум вашых сказы ў свет ішлі».

У гэтых пажаданнях крыецца глыбокі сэнс. У словах прывітання раскрывае паэт свае адносіны да нашай паэзіі, да яе месца ў жыцці, да яе характару. Няма патрэбы раскрываць гэты сэнс, ён-жа такі ясны і зразумелы для кожнага з нас.

Я. Купала—вялікі паэт і вялікі настаўнік падрастаючага паэтычнага маладняка—многа зрабіў для росту і развіцця нашай паэзіі, многа зрабіў для таго, каб лёс гэтай паэзіі быў радасны і шчаслівы. У шматлікіх творах яго знаходзім мы яго думкі аб паэзіі, аб літаратуры, аб месцы і ролі ў грамадскім жыцці нашых пісьменнікаў, аб станаўленні іх да гэтага жыцця. Самыя страсныя радкі прысвячае ён вобразу «вялікага друга народаў усіх», вобразу найвялікшага пісьменніка рускага народа Аляксея Максімавіча Горкага, памяці выдатнага паэта-бунтара Тараса Грыгоравіча Шаўчэнкі. З выключнай цеплынёй спявае ён аб сонечным Руставелі, аб Сулеймане Стальскім. Задушэўным словам вітае ён легендарнага Джамбула, зычыць шчасця і радасці свайму далечніку Якубу Коласу:

Хай сонца след табе карчуе
Да новых песень каласістых.
Хай кожны жне, хай пачуе,
Як мы йдзём сцежкай залацістай.

Словамі глыбокага смутку апявае ён памяць Эдуарда Самуйлёнка:

Восенню кветкі завянуць у полі,
Кветцы засохшай ізноў не цвісці.
Думкі твае не завянуць ніколі,
Думкі аб нашым прыгожым жыцці.

Я. Купала горача любіць творцаў сапраўднай паэзіі, сапраўднай літаратуры і патрабуе ад сучасных пісьменнікаў такія творы, якія-б былі карыснымі для народа, такіх «песень, што птушкай луталі-б над полем і шчасце тварылі-б ад летаў да летаў», якія-б «славу вякоў, пакаленняў мінулых сваёй перамогай геройскай устрэслі». Такіх песень, каб:

... Рахі няслісь па свету абшарах,
І слава грымела прастораў бязмежных,
І распаляла паўстанняў пажары
У нашых скаваных братоў зарубежных.

Яшчэ ў 1931 годзе ў сваім вершы «Маладым паэтам» Я. Купала страсна заклікае маладых песняроў:

Ад вас, Кастрычніка сыны,
Ад вашых сэрцаў пролетарскіх,
Як ніва сонечнай вясны,
Чакаюць песень — а бунтарскіх —
Заводаў гулкія гудкі,
Калгасны працавіты трактар,
Чырвонай арміі штыхі
І пагранічнаў нашых варта.

Можна было-б прывесці шмат паэтычных выказванняў Я. Купалы аб нашай літаратуры, але гэта тэма спецыяльнага артыкула. Мы спынімся толькі на некаторых думках паэта аб сучасным літаратурным жыцці, аб некаторых літаратурных падзеях і адмоўных з'явах у літаратурным асяроддзі. Ён глыбока ненавідзіць усякую гніль у літаратуры, рэшткі старой багемшчыны, абывальшчыны, правы недастойнай канкурэнцыі, рэшткі рапаўскіх заскокаў. Ён жорстка высмейвае тых «крытыкаў», «майстроў з разборам», якія, не разумеючы і не ведаючы ні жыцця, ні літаратуры, — «не ўзнімуць воч вышэй халяў», — тым не менш пускаюцца ў крытычныя паходы, і не маючы «ні прынцыпаў тых, ні ідэй», «з гразёй» змешваюць «што йшчэ ўчора так падхалімна» выхвалялі. Гэтых незайздросных «грызапёраў» ён параўноўвае з бабай, якая на куцці варожыць, каб «аб кім, аб чым, шт... сказаць». А хіба не пазнае сябе ... шых «пісьменнікаў» у гэт... ных купалаўскіх радках:

Зірнеш. Брыдзе сабе фігура:
Мо' ён чарняў, мо' белабрыс...
Згадай, што гэта за натура? —
У снах аб почасцях закіс.
Нічога-ж слаўнага не даўшы
Сваёй краіне, грамадзе, —
У гонар лезе, грозна страша
Курэй на цётчынай градзе.

І вось гэта «фігура», якая «піша ве... шы, раманы, драмы і сцэнар», гістэрыч... патрабуе часам: «Іграй мне славу!»

І гнеўна пытае Янка Купала гэтыя «фігуры»:

А ці падумаў лепшы-першы,
Як прыме гэта гаспадар?
Той гаспадар, што сее зёрны,
Што косіць, жне, дае нам хл...
Што сталь гартуе ў кузні г...
Што раскаваў пямніцы склеп...
З вялікай нянавісцю пытаецца
На службу вам зямля і неба
Даны — адно пішы з душы.
Якога-ж чорта йшчэ вам тра...?
Якой чакаеце імшы?!

Гэтае запытанне ўпаўне справядліва і ўпаўне да месца. І хоць гэтыя рад... пісаны тры годы таму назад, ... стаюцца ў сіле і на сёнешні д... ўсіх тых, з дазволу сказаць, літар... якія спрабуюць пісаць свае «творы ... «матэрыялах», высасаемых з ула... пальца.

Адзначаючы сёння 35-годдзе вял... нашага паэта, аднаго з асновапало... беларускай літаратуры, выдатнага п... Янкі Купалы, нам хочацца шчы... даць яму глыбокай уцехі ў яго... паэтычнай дзейнасці і плённ... адказнай і пачэснай справе ... маладых паэтаў і пісьменнік... дзімы.

Д. САВАНОВІЧ

„Шляхам жыцця“ Я. Купалы

У 1913 годзе ў Пецербургу выйшаў у свет зборнік вершаў Янкі Купалы «Шляхам жыцця». Гэта была яркая з'ява не толькі беларускай літаратуры, узбагаціўшая яе высокай культурай мовы і верша: вартасці зборніка вылучаліся на фоне ўсёй літаратуры народаў Расіі, у тым ліку і літаратуры рускай. Не выпадкова зборнік быў заўважан В. Брюсавым, які некалькі вершаў з яго перакляў на рускую мову.

Вершы, якія ўвайшлі ў зборнік, былі напісаны ў перыяд чорнай рэакцыі, якую перажывала ўся дэмакратычная Расія пасля падаўлення рэволюцыі 1905 года. Большасць пісьменнікаў, звязаных з буржуазным лібералізмам напярэдадні 1905 года, адышла ў містыку, у сімвалізм, занялася апалогіяй «ночы», што ў палітычным сэнсе азначала адмаўленне ад рэволюцыі, ад барацьбы. У гэтых умовах Я. Купала пісаў аб сваёй песні:

З думкамі ходзіць забранага краю,
Служыць і верыць у лепшы усход...
Бо, калі гасне паходня старая, —
Новую заўтра распаліць народ.

Заветная мара аб адраджэнні радзімы і звязаная з ёю мысль аб соцыяльным перавароце, аб дэмакратычнай рэволюцыі, мысль, якую Я. Купала прынёс у паэзію з гушчы народнага жыцця, утрымала яго ад матываў заняпаду адмаўлення ад барацьбы і жыцця, паставіла яго ў першыя рады перадавой літаратуры народаў былой Расіі ў перыяд ад 1905 года да вялікага Кастрычніка.

Матывы радзімы і яе вызвалення ў Я. Купалы павінны быць ацэнены строга гістарычна. Гарачая любоў да радзімы, заклік да барацьбы за яе самастойнасць, успаміны аб задушаных у мінулым парастках яе самабытнай культуры былі законнымі пачуццямі беларускага народа; вершы Я. Купалы былі прагрэсіўны настолькі, наколькі іх патрыятызм быў накіраван супроць напоўзгніўшага будынка Расійскай імперыі — турмы народаў; тым самым яны аб'ектыўна служылі на карысць соцыялістычнай рэволюцыі, якая спела ў тыя годы. Нельга папракаць Я. Купалу, што патрыятызм яго ў тыя годы яшчэ не зліўся з ідэяй пролетарскага інтэрнацыяналізма. Аднак, яго патрыятызм, як сапраўды народны, як выражанае беларускім народам патрабаванне сваіх чалавечых правоў, патрабаванне «людзьмі звацца», не адмаўляла ідэі дружбы і братэрства народаў. Не выпадкова ў зборніку «Шляхам жыцця» ён змяшчае пераклад уступу да «Канрада Валленрода» Міцкевіча, дзе выражан смутак у сувязі з варожасцю і войнамі паміж народамі. Не выпадкова Я. Купала хацеў бачыць у Шаўчэнку «бацьку» не толькі украінцаў, але і беларусаў. Не выпадкова від вадаспада Іматры ў сумнай Фінляндыі асацыіраваўся ў яго з мысляю аб свабодзе Суомі («Іматра»). І, разам з тым, зборнік «Шляхам жыцця» поўны хвалюючых старонак, дзе з вялікай задушэўнасцю і сілай прагучала любоў Я. Купалы да роднай Беларусі, да яе скромнай прыроды, да яе працавітага народа. Ніякія багацці другой, больш высокай, нацыянальнай культуры не маглі заслапіць ад яго «пушчы Белавежскай гоман», «рэчку з плытнікамі Нёман», «хату і бярозкі беларускай вёскі». Гэтыя радкі зразумелы і дарагі кожнаму совецкаму чытачу, якой-бы нацыянальнасці ён ні быў, як зразумелы і смутак Міцкевіча па роднай «Літве» ў Расіі, як зразумелы яму і «Радзіма» Лермантава, і вершы Пушкіна, Некрасава.

Я. Купала папамінаў, што на тэрыторыі Беларусі адбывалася багатае гістарычнае жыццё славянскага племені, што народы яе не раз прымалі ўдзел у гістарычных падзеях, што былі ў ёй і пачаткі задушанай самастойнай культуры. У сімвалічнай паэме «На дзяды» Я. Купала ва ўмоўнай форме паказвае тую здраду пануючых класаў Беларусі свайму народу, сваёй культуры, якая сказалася ў падпарадкаванні Беларусі Літоўскаму княжаству, а затым Польшчы. У сувязі з гэтым знаходзіцца і абарона роднага слова («Роднае слова», «Ворагам беларушчыны» і інш). Усё гэта мела свой прагрэсіўны сэнс ва ўмовах таго цкавання, якім суправаджалася паяўленне беларускай культуры ў пачатку XX стагоддзя, цкавання з боку вялікадзяржаўных шавіністаў, якое знаходзіла апору ў палітычным бяспраўі Беларусі.

На фоне ідэйнага заняпаду літаратуры паэзія Я. Купалы вылучалася як паэзія вялікіх ідэй, высокага грамадзянскага пафасу. Патрэбна была велізарная вера ў народ, каб перамагчы той змрок і роспач, якія нараджала эпоха рэакцыі. Я. Купала з вялікай вайстрынёй перажываў перамогу чорных сіл контррэволюцыі:

Бледныя, буднія дні
Сумна па роднай зямлі
Мутнай плывуць паласой;
Часам, калі-ні-калі
Дзе-ні-дзе бліснуць агні,
Глянуць крывавай расой, —

піcаў ён аб сваёй радзіме. Сучаснасць уяўляецца яму як царства ночы, як урачыстасць чорнага бога, які ўступіў у барацьбу са святлом («У начным царстве», «Чорны бог», «Хохлік» і інш.). Тут Я. Купала сутыкаецца з рускім сімвалізмам, з крутам тых вобразаў і матываў, якія былі тыповы для многіх рускіх паэтаў. Але вобразы «начнога царства» з'яўляюцца ў яго не столькі паказальнікам сімвалісцкага светапогляду і містыкі, колькі сродкам псіхалагічных адносін да грознай д... рэчаіснасці. Вобразы гэтыя разам ... глыбока своеасаблівыя. Яны звяза... беларускім фальклорам:

Як зайграе ў лесе хохлік, —
Замірае песень воклік;
Як зачэпе мох і лозы, —
Аджываюць смех і слёзы...
У цёмным яры скачуць ча...
Кветка чахне на папары,
Ліст трасецца на асіне,
Вогнік блукаецца сіні.
Барадой лясун ківае,
Шалы нетрай спавівае;
Ваўкалак за дамавінай
Вышаўзае на пушчу.

Але ў сазнанні народа жыве мара аб кветцы шчасця, і гэта мара падтрымлівае Я. Купалу ў яго барацьбе з «чорным царствам» («На купалле», «Заклятая кветка»). Вясна, паводка, жніво, касьба сімвалізіруюць у яго перамогу светлых сіл яго радзімы. У вершы «Касцам» ён пісаў аб сваёй заветнай мары:

Ці дажджуся калі кос і песень касцоў
На другой, на вялікай касьбе? —

памякаючы на надыходзячую рэволюцыю.

Ніякія начныя чары не маглі задушыць сіл рэволюцыі. Вера Я. Купалы ў перамогу светлых сіл знаходзіла падтрымку ў тым ажыўленні дэмакратычнага ... люцыйнага руху, якое намецілася ... манту выхаду зборніка «Шляхам ж... Хутка ажыццявіліся заветныя мары ... палы.

Усю Беларусь, неаб'ятну, як мо...
Убачыць у ясным, як сонца, свя...

І ў нашы дні, калі вялікі белару... род з'еднан у адной беларускай ... яму, як і ўсім народам Совецкага Саю... дораг і блізак пафас нацыянальнага вызвалення, як успамін аб слаўных старонках сваёй мінулай барацьбы, і совецкі чытач здольны аб'ектыўна і гістарычна ацаніць сапраўдны сэнс нацыянальнага пачуцця, што прагучала ў вершах Я. Купалы.

ВОБРАЗ НАРОДА Ў ТВОРАХ ЯНКІ КУПАЛЫ

★ М. КЛІМКОВІЧ ★

Грамадскасць Савецкага Саюза святкуе 35-годдзе літаратурнай дзейнасці народнага паэта БССР, аднаго з буйнейшых паэтаў сучаснасці — Янкі Купалы. На многіх дзесятках моў у гэтыя дні паўтараць народы нашай вялікай радзімы светлыя песні Я. Купалы аб сейбіту народнага шчасця — аб вялікім Сталіне, аб чырвонай сталіцы Маскве, аб сталінскай дружбе народаў, аб Чырвонай Арміі і яе слаўных перамогах.

Творы Я. Купалы раскрываюць многія старонкі з гісторыі беларускага народа, яго барацьбы супроць сваіх прыгнятальнікаў, раскрываюць радасць перамог, радасць будаўніцтва новага шчаслівага жыцця. Па гэтых творах чытачы братніх рэспублік знаёмяцца з воблікам беларускага народа, з яго гераічнай барацьбой за сваё вызваленне, за знішчэнне жудаснага мінулага былой поўкалоніі рускага царызма, за стварэнне Савецкай Беларусі.

Вось перад намі паэма Я. Купалы «Курган». Яна васкрашае далёкае мінулае народа, яго сярэднявечча. Кісцю вялікага мастака, узнімаючыся да народнага эпасу, малюе Я. Купала вобраз старога гусляра, які не пабаяўся сказаць князю ў вочы народную праўду, праклён усяму княжацкаму роду.

Ты брыльянтамі ўсыпаў атласы і шоўк —
Гэта мёртвая сталь ад кайданаў,
Гэта вісельні петляў развіты шнурок,
Гэта, княжа, твае саматканы.

«Курган» — магутны гімн народнай сіле, маральнай велічы і свабодалюбству народа. Нішто не магло зламаць гусляра — ні пагроза смерці, ні золата, ні жудасныя мукі тых, каго князь кінуў у халодныя падвалы замка.

Бачыш, княжа, загоны, лясы, сенажаць, —
Ім пакорны я толькі з гуслямі.
Сілен, княжа, караць, галаву сілен зняць, —
Не скуеш толькі дум ланцугамі!

Вобраз Баяна народных легенд і паданняў, носьбіта вышэйшай праўды, стаяў перад Я. Купалам, калі ён пісаў гэту паэму. У гэты вобраз ён укладваў любімыя рысы народа і сваё разуменне адданага служэння народу.

...ругая паэма — «Бандароўна». ...сіць нас на Украіну ў часы ...ыгону. У ёй Купала стварыў ... вобраз дзяўчыны з народа, ...обрала смерць замест здзекаў пана ...яе чалавечай годнасцю.

Затраслося помстай сэрца
У грудзі дзявочай,
Спахмурнелі чорны бровы,
Заіскрыліcь вочы.
Не такую, ясны пане,
Бачыш прад сабою,
Што захоча чэсць і славу
Прадаваць з табою.

Смерць гераіні ўскалыхнула народныя масы, выклікала народную помсту панам Патоцкім і ўсяму панскаму каралеўству.

Задымелі у пажарах
Панскія сялібы,
Палілася кроў ракою
На лугі, на скібы.

...такой расправе з панамі марыў паэт ...ія змрочныя часы рэакцыі пасля ...года, звяртаючыся за прыкладамі ...гісторыі.

...мінаецца і вядомая драма Купалы «Раскіданае гняздо», якая адлюстроўвае трагедыю селяніна, якога пан выганяе з зямлі, аблітай потам і крывёю многіх пакаленняў, толькі таму, што царскі ўрад ...аў гэту зямлю панскай уласнасцю, ...ніна — бестэрміновым арандатарам. ..., дзе панская сіла, законы не ... і селяніна ад канчатковага разарэння ... выгнання з роднага гнязда. Больш ... пан губіць дачку селяніна і пускае ...ую маці яе ў жабракі. Дарэмна сын ...яніна даходзіць закона і праўды. Няма для беднага люду там, дзе пануе ўласць і сваволя багацця. І тады ўсплывае ... аб рэвалюцыі, аб народнай сіле, ... зможа знішчыць пянавісны і не...івы лад.

Гэту мару бачыў Я. Купала і ў больш рэалістычных абрысах. У сваім вядомым вершы «Перад вісельняй» ён малюе вобраз рэвалюцыянера, воіна за свабоду, які пайшоў напралом супроць царскага ладу «за праўду пастаяць сваю». Хай ліхакуль-што святкуе перамогу цар і жандары, але іх свята і спакой назаўсёды атручаны ўспамінамі, як:

Падымаўся люд скаваны,
Няволі рваліся кайданы,
За трупам клаўся трупаў вал!

Рэвалюцыянер упэўнен у перамозе той справы, за якую ён аддае жыццё. Ён горда гаворыць крывавым катам:

Але не стану біць наклонаў.
За сваю гібель не эмаўчу,
Знаць не хачу вашых законаў,
Знаць вашых судзяў не хачу!

З-пад вісельні ён кідае прарочыя словы цару і яго прыслужнікам, памешчыкам і капіталістам:

Не доўга-ж ваша панаванне —
Загуба прыйдзе і на вас!
Загубу крыўдаю, слязамі
У магільны выкапалі ніз,
Людской расплаты ўжо над вамі
Тапор адточаны завіс.

Ніхто з беларускіх пісьменнікаў не стварыў такога яркага вобраза беззямельнага селяніна, які вымушан быў перабірацца з аднаго маёнтка ў другі ў пошуках магчымасці прыкласці свае рукі да працы, як Янка Купала:

Наклаўшы зрыўкаў, лахманоў,
Убор саміх і хат гнілых,
З адных павыгнаны вуглоў,
Шукаць цягаліся другіх.
Худыя жонкі на вазах,
Пры жонках дзеці чарадой.
Мы самі ў зношаных лапцях
Ідзем за коньмі пехатой.

У мілагучных, авеяных вялікім спачуваннем і любоўю песнях беззямельнага вырысоўваецца перад намі жыццё беззямельнага ад нараджэння да скону. Нават у магіле ён не ведае спакою:

Крыжы ядовыя
На бок схіліліся,
Насыпы пасмертныя
Вадой размыліся.

Я. Купала ўпарта напамінае, паўтарае думку беззямельнага аб тым, што вакол многа зямлі, якую ён апрацоўвае сваімі рукамі, але гэта зямля незаконна забрана панамі і ахоўваецца царскім ладам. З горкай іроніяй ён кажа: «ідзі ў двор да пана, як ішоў твой бацька і дзед».

Там працуй і гаруй: маладых
Сваіх сіл на чужых не жалей,
Мазалёў не жалей ты сваіх,
Як крыві не жалеюць тваей.

І гэта іронія адлюстроўвае пянавісць народа да пана памешчыка, тую пянавісць, якая падняла народ на рэвалюцыю 1905 года і якая змяла паноў у 1917 годзе, «дапоўніўшы пролетарскую рэволюцыю другім выданнем сялянскай вайны».

Я. Купала прыйшоў у літаратуру яркім прадстаўніком беларускага сялянства, агрэбленага царом і памешчыкамі. Ён вынес на старонкі сваіх кніг яго дэмакратычныя патрабаванні. Ён апеў не толькі гора народа, але і яго непахісную волю дабіцца шчаслівага жыцця. Ён будзіў сваімі песнямі веру ў сілы народа. Гэту мэту ён паставіў з першых радкоў, надрукаваных трыццаць пяць год назад. Яго «Мужык», з якога «усе смяюцца, пагарджаюць», дзеці якога «галеюць век без хлеба», які сам працуе «як вол рабочы», вуснамі Я. Купалы заявіў: «Я буду жыць, бо я мужык», г. зн. чалавек працы. «Пан сахі і касы», якому «праца сілу дала», якому «свет ад шчасця закрыт» тым, што яго працу з'ядаюць паразіты, — вырастае ў сапраўды магутную сілу, калі бярэ касу і ідзе грамадой на луг, ці на іншую касьбу — касіць галовы панам. На гэту касьбу заклікаў Я. Купала мужыка ў многіх вершах:

І ўсё мінецца.
Народ, прачніся.
Крыўды галосяць,
Паўстань і мсціся!
(«Даўней і цяпер»).

Я. Купала страсна будзіў народ і заклікам трыбуна, і вострым сарказмам, і ціхай слязой над яго доляй, каб народ зразумеў, што далей так жыць немагчыма, каб народ не ўпадобіўся Паўлюку, які «сагнуўшы плечы ў крук, араў зямлю» і так-такі:

Памёр і не спазнаў,
Што на чужых араў
Ўвесь век чужое поле.

Вобраз дзяўчыны-сіраты, вобраз удоўкі, муж якой забіт на руска-японскай вайне, а галодныя дзеці мерзнуць у хаце, вобраз жнеяк на полі, вобраз забітых горам людзей, якіх цар можа «уцешыць» толькі астрогам і куляй, — усё гэта страсны заклік да змены праклятага царскага ладу.

І зусім законамерна перарастаюць гэтыя вобразы ў вобраз селяніна, які:

...За крыўду сваю адамсціць,
Свінням будзе крыві не пабраць!
Адамсціць, аж зямля задрыжыць,
Аж віхры зашумяць, загудзяць.

Я. Купала бачыў, што беларускі народ можа знайсці сваё вызваленне толькі ў агульнарасійскім вызваленчым руху, і заклікаў народ да падтрымання гэтага руху, да агульнай барацьбы з царызмам.

Прыйшла рэволюцыя, змяніла долю народа. Народ без цара і паноў пабудаваў сваё жыццё. І, як верны Баян народа, змяніў свае песні Я. Купала. Сонечным святлом і цяплом пранізаны яго песні, яркімі фарбамі шчаслівага жыцця заззялі вобразы беларускага народа ў яго творах. У 1923 годзе ён прысвячае комсамолу цудоўны верш «Арлянятам»:

Вам на памяць Серп і Молат
Даравала доля,
Каб з вас кожны быў, як волат,
Не гнуў плеч ніколі!
Каб здабытую свабоду
Зналі, шанавалі
І у цяжкую прыгоду
Усталі грознай хваляй.

З таго часу шчаслівая савецкая моладзь — асноўны вобраз паэзіі Я. Купалы. І сын, якога маці выпраўляе ў Чырвоную Армію вартаваць мірную працу народа, і героі-чэлюскінцы, якія патрэслі свет легендарнымі подвігамі на славу радзімы, і маладая маці-калгасніца з сваёй песняй на жніве аб шчаслівым маленстве сваіх дзяцей, і шэсць сыноў, якія кажуць свайму бацьку аб той рабоце, якой яны будуць служыць народу, і Алеся, якой традыцыйная зязюля не ўгадала яе будучыні і якая цяпер «самалётавым крыллем воблакі калыша», — усё гэта вобразы шчаслівай савецкай моладзі. Перад ёй раскрыты ўсе шляхі жыцця і кожны шлях дае магчымасць разгарнуць свае здольнасці і, здабываючы шчасце для ўсіх, быць шчаслівым. Упартая работа па асушцы балот над ракой Арэсай і калгасная вечарынка, тытанічная праца па адбудаванню знішчанага белапалякамі Барысава і мірная бяседа калгаснікаў у паэта, гераічныя паходы Чырвонай Арміі, вызваленне Заходняй Беларусі і палёт самалёта «Радзіма»—натхняюць паэта на песні аб новых пачуццях, аб новых людзях савецкай краіны, аб іх сіле, аб іх славе, аб іх адданасці партыі і радзіме. І самыя лепшыя свае творы прысвячае паэт правадыру народаў, натхніцелю нашых перамог — Іосіфу Вісарыёнавічу Сталіну, складаючы з лепшых жамчужын сваёй творчасці вобраз правадыра. І у гэтым, як і ва ўсёй сваёй творчасці, Я. Купала верны свайму творчаму прынцыпу—быць заўсёды з народам, перадаваць яго думы і пачуцці, радавацца яго радасцямі, любіць яго любоўю.

Святкуючы 35-годдзе творчай дзейнасці народнага паэта БССР Янкі Купалы, савецкая грамадскасць жадае яму яшчэ доўгія, доўгія годы жыць і тварыць на карысць радзімы.

ЮБІЛЕЙНЫЯ ВЫДАННІ ТВОРАЎ ЯНКІ КУПАЛЫ

Дзяржаўнае выдавецтва пры СНК БССР к 35-годдзю літаратурнай дзейнасці народнага паэта БССР Янкі Купалы выдала два зборнікі яго твораў.

У зборнік «Паэмы» увайшлі ўсе лепшыя паэмы Я. Купалы, напісаныя ім у дакастрычніцкі і паслякастрычніцкі час. Сярод іх «Курган», «Магіла льва», «Бандароўна», «Зімою», «Адплата кахання», «Над ракой Арэсай», «Табе, правадыр», «Тарасова доля» і інш. Уступны артыкул да зборніка напісаў В. Барысенка. Тыраж кнігі 10.000 экземпляраў.

Зборнік «Курган» складаецца з гістарычных паэм «Курган», «Магіла льва», і «Бандароўна». Выйшаў ён у перакладзе на рускую мову. Уступны артыкул да паэм на рускай мове напісаў Г. Бярозкін. Тыраж кнігі 10.000 экземпляраў.

У 1941 годзе сектарам юнацка-дзіцячай літаратуры будуць выданы драма «Раскіданае гняздо» і «Выбраныя вершы» (школьная бібліятэка), а таксама некалькі кніг для дзяцей дашкольнага і малодшага ўзросту.

Г. К.

Навуковыя работы аб творчасці Я. Купалы

У планах навукова-даследчых работ Акадэміі навук БССР на 1941 год адной з вядучых тэм па аддзяленню грамадскіх навук з'яўляецца даследванне жыцця і творчай дзейнасці Янкі Купалы.

Дырэктар Інстытута літаратуры і мовы Акадэміі навук БССР тав. В. В. Барысенка піша доктарскую дысертацыю аб творчасці Я. Купалы.

Многія аспіранты і навуковыя работнікі вышэйшых навучальных устаноў узялі тэмамі сваіх дысертацый тыя альбо іншыя галіны творчасці Я. Купалы. Распрацоўваецца пытанне аб сімвалізме ў дарэволюцыйнай творчасці Я. Купалы, даследуецца праблема кампазіцыі і стылю купалаўскіх паэм.

Дацэнт Магілеўскага педагагічнага інстытута імя Папаніна тав. Н. М. Пятровіч закончыў кандыдацкую дысертацыю на тэму «Янка Купала і Тарас Шэўчэнка».

І. Г.

Літаратурныя вечары

Згодна рашэння камісіі па правядзенню 35-гадовага юбілея народнага паэта БССР Янкі Купалы, у буйнейшых абласных цэнтрах Савецкай Беларусі будуць праведзены літаратурныя вечары, прысвечаныя юбіляру.

Літаратурныя вечары намечана правесці з 10 па 20 снежня. Для ўдзелу ў іх з Мінска выедуць брыгады пісьменнікаў.

Вялікі літаратурны вечар будзе праведзен у гор. Лідзе — горадзе, працоўныя якога выбралі Янку Купалу дэпутатам у Вярхоўны Совет БССР.

Прыезд гасцей

Для ўдзелу ў святкаванні 35-гадовага юбілея літаратурнай дзейнасці народнага паэта Янкі Купалы ўчора ў Мінск прыехалі прадстаўнікі Саюза пісьменнікаў Літоўскай ССР і дэлегацыя Беластоцкага аддзялення ССП БССР.

Сярод прыбыўшых гасцей — народны камісар асветы братняй Літоўскай ССР тав. Антанас Венцлова і сакратар Саюза пісьменнікаў Літоўскай ССР тав. Петрас Цвірка. З Беластока прыбылі пісьменнікі: дэпутат Вярхоўнага Совета СССР тав. Філіп Пестрак, т.т. Максім Танк, Д. Сфард, Ш. Берлінскі і І. Рубінштэйн.

Чакаецца прыезд гасцей з Масквы і іншых братніх рэспублік.

Ів. ГУТАРАЎ

ВОБРАЗЫ „РАСКІДАНАГА ГНЯЗДА“

Па характару дзеяння, зместу і вобразах «Раскіданае гняздо» Янкі Купалы прадстаўляе сабою сацыяльную драму, тэмай якой з'яўляецца трагічнае становішча беззямельнага селяніна ў дарэволюцыйныя часы. Тэма гэта ўзнікла з біяграфічнага вопыту аўтара, падказвалася яму ўсім яго жыццём і знайшла сваё паэтычнае ўвасабленне ў лірыцы, эпасе і драматургічных творах Я. Купалы.

У паэме «За што?» Я. Купала паказвае, як селянін-арандатар Юрка Дзяцель сорак год жыў на панскай зямлі. Пасяліўся на пустым дзірване, паліваў яго сваім потам і слязамі, выцерабіў гушчары, акуратна плаціў двару чынш грашыма ці работай.

Але, як той кажа,
Усё у нас не вечна:
Годзе Юрку жыці
З хлебам ды бяспечна!
Новы пан прыехаў
І змяніў парадкі:
Загадалі Юрку
Выбірацца з хаткі.

Гэткая-ж сацыяльная сітуацыя легла ў аснову драмы «Раскіданае гняздо»

Шмат год жыў Лявон Зяблік са сваёй сям'ёй на арандаванай панскай зямлі. З дзедам садок садзілі. З бацькам бярвенні цягалі на хату. Падарваўся стары, памёр. Лявон адзін мусіў канчаць будову сялібы. Ён зжыўся з зямелькай, як з роднай маткай. Кожны каменьчык на полі і кожны кусцік на сенажаці змалку ўжо знаў, як сваіх пяць пальцаў. На гэтых гонях пасвіў скаціну, араў, сеяў, касіў. А тут вярнуўся малады пан з далёкага краю, з навук, і пайшло ўсё ўверх дном. Пяць год судзіўся Лявон за зямлю, шукаў праўды і не знайшоў. Суд вынес рашэнне на высяленне. На гэтым пачынаецца завязка дзеяння.

Кожная дзеючая асоба твора па-рознаму рэагіруе на гэта з'явішча, выяўляючы свой характар, сваю сістэму поглядаў. Так, бацька — Лявон, страціўшы надзею знайсці праўду праз суд, — павесіўся. Рэлігійная маці — Марыля ўспрымае панскі здзек, як божую кару. Адсюль у яе непрацівленства і пакорлівасць лёсу. «Я казала, што нічога не выйдзе. Ці з багатым беднаму судзіцца? Пакуль з багатага пух, то з беднага дух».

Зусім іншае, проста супроцьлеглае прадстаўляе сабою характар Сымона. Асноўнымі рысамі яго характару з'яўляюцца настойлівасць, непакорлівасць. Вось найбольш трапныя і найбольш характарызуючыя яго рэплікі: «Пакуль будзе хоць якая малая магчымасць, то не дадзімся жыўцом ваўку ў зубы». «Які я ўжо ўдаўся, такі і буду, а свайго ў крыўду не папушчу, хоць-бы там свет дагары нагамі перакуліўся».

Уся натура Сымона пранікнута глыбокай нянавісцю да паноў. У свой час бацька павучаў Сымона: «Трэба праўды шукаць не тапаром, а розумам. Дзед твой не меў розуму, я не маю, але ты яго май, каб з часам цябе і тваіх дзяцей не гналі гэтак, як сягоння».

Сымон належаў яшчэ да таго пакалення барацьбітоў з сялян супроць памешчыкаў, якое раздзіралася супярэчнасцямі паміж старымі звычаямі (абмежаванасць уласным кавалкам зямлі, рэлігійнымі абрадамі, індывідуальным змаганнем за сваё асабістае шчасце) і — новымі, нараджаючыміся і развіваючыміся арганізаванымі спосабамі барацьбы супроць эксплаататарскага ладу. Гэта відаць з таго, як моцна прывязан Сымон да таго кавалка зямлі, які раней арандавала іх сям'я: «Ніхто нас адгэтуль не згоніць і не выстрашыць, каб хоць самога Люцыпара на помач выклікаў. Спакон вякоў усё гэта наша было, ёсць і будзе. Мы не прыблуды якія. Мы не маем права і кроку даць адгэтуль у тую старану». Абмежаванасць яго праявілася і ў рэлігійнасці ўяўленняў: «Уночы, — ён кажа, — пайду з крыжам на магілкі, як відма якое з таго свету, каб аж нябожчыкам жутка было. Адзін тата мяне мой пазнае і радасна выйдзе камне на спатканне, — падзякуе за крыж і благаслаўленне сваё дасць мне на далейшую вытрываласць, на далейшую барацьбу з нядоляй. Бо ён, тата наш, інакшы, як усе нябожчыкі: ён не лёг з імі ў адным месцы, а зусім асобна, захаваўся ў сырой маці-зямельцы. І крыжык яму панясу я ўночы, а не ўдзень, як гэта ўсім носяць і стаўляюць».

У сэнсе набыцця жыццёвага розуму і практычнага вызваленчага вопыту далейшы крок прадстаўляе сабою вобраз хлапчука Данілкі. Данілка многа агульнага мае з характарам Сымона. Ён такі ж непакорны і настойлівы. Яшчэ ў самым пачатку драмы ён заўважае: «Сымонка, ты па мне пайшоў: і я хоць галавой налажу, а скрыпачку ўсё-такі зраблю сабе новую». Але ён не такі апраметчывы і не такі рызыкоўны, як Сымон. «І што гэта Сымон думае з сваёй рызыкай! Ух, аж мяне пачынае злосць на яго разбіраць» — гаворыць ён. Данілка крытычна адносіцца да жыцця і людзей. Ад Сымона ён узяў настойлівасць, ад маці — любоў да меншых, слабейшых і пакрыўджаных, ад старца — развагу, вытрыманасць, ўменне супакоіць чалавека ў горы і бядзе, ад бацькі вучыцца розуму. «Няхай сабе кажуць, што я дурнаваты, — разважае ён з Зоськай, — што я такі, што я гэткі. Але я ўсё бачу і ўсё разумею». Ня гледзячы на сваю юнасць, ён добра ведае людзей і правільна арыентыруецца ў жыцці. Зосьцы ён адкрывае вочы на тую жыццёвую праўду, што «паніч, як ажэніцца з намі суд, едзе кудысь за мора жаніцца».

Ён таксама супакойвае і маці ў яе горы, пераключаючы размову аб смерці бацькі на іншую тэму. Усе яго рэплікі напоўнены жыццёвым гумарам і сведчаць аб багатых назіраннях і ўражаннях.

Вобраз Данілкі не закончан, паказан толькі ў працэсе станаўлення. Канчаткова яго фарміраванне за межамі дзеяння драмы. Але ён пайшоў у свет, пайшоў у людзі, і пайшоў бадзёрым, прамым чалавекам, і праўду такія знаходзяць.

Асобнае месца ў драме займае вобраз Зосі. Зося — ахвяра тагочасных сацыяльных суадносін, яна пакорна ўспрыняла і чотка сфармулявала горкую для сябе ісціну: «Жыццё свае кросны жалобныя тчэ і будзе ткаць, пакуль яму самі людзі не дадуць асновы з вечнай праўды і братняга мілавання, а ўтоку — з вечнай шчаслівасці і радасці». Яна з вялікім парывам жадала такога часу. Але аднаго жадання для змянення сацыяльнага ладу мала, і яна загінула са сваімі гарачымі марамі і чалавечымі пачуццямі ад чалавека-звера, які належаў да гаспадароў гэтага дзікага ладу і асудзіць якога яна змагла толькі ў беспрытомнасці. Асэзнанне рэальных адносін да яе паніча аказалася для Зосі спазніўшымся, чаму вобраз Зосі можа быць павучальным толькі сваім лёсам, а не складам дум і не дзеяннем.

«Раскіданае гняздо» з'яўляецца як-бы завяршаючым творам у літаратурнай дзейнасці Купалы перыяду 1905—1914 го... балючыя пытанні тагочаснага жыцця сялянства гэты твор узнімае на ўзровень сацыяльнага драматызму. Асноўным пытаннем для ўсіх дзеючых асоб драмы з'яўляецца гнеўны крык «За што? за што?» І сапраўды, як разважае Лявон: «Чынш плацілі, талаку рабілі ў двор, як паншчыну якую; пасеку карчавалі, будаваліся... Вечна думалі жыць, а цяпер! Цяпер сын і ўнукі будуць «служыць і жабраваць...» А дзе праўду шукаць і як — для іх невядома. Гэта была для сялянства, як апаніў старац, такая пара, калі «старыя парадкі раскідаюць па свеце, а новых лепшых нешта не відаць і не відаць». Гэтых новых, лепшых парадкаў канкрэтна не ўяўляў сабе ў той час і сам драматург. Сваім творам ён адлюстраваў усе асноўныя супярэчнасці дарэволюцыйных сялянскіх мас, іх нянавісць да існуючага ладу, жаданне шукаць і дабівацца лепшага жыцця, упэўненасць у тым, што час ... трэбны настаў, «кончылася чалавечае в...нае начаванне, і світанне агністае па...паецца на зямлі ад краю да краю, ад мора да мора!» (словы Незнаёмага) і — па...тычную няспеласць, няўменне бачыць правільна ўспрыняць сапраўдныя мет... барацьбы за вызваленне. Але гэты т... вучыў ненавідзець памешчыкаў і капіталістаў, узнімаў пратэст супроць прыг...ту, і ў гэтым яго вялікае значэнне.

К. ГАНЧАРОЎ

Паэма „Курган“

...дваццаць пятым нумары «Нашай ...» за 1912 год была змешчана паэма ...лы «Курган».

... азнаменавала новы рубеж у раз...ларускай літаратуры, якая, асвой...сусветную літаратурную спадчыну, ...ла даваць арыгінальныя творы на ...ле жыцця і барацьбы беларускага народа.

У «Кургане» Я. Купала ўзняў самыя важныя і прынцыповыя для беларускай літаратуры таго часу пытанні: роля паэта, функцыянальная значымасць паэзіі.

Асваенне паэтычных форм лепшых узораў класічнай літаратуры свету, з аднаго боку, уменне выкарыстаць невычарпальныя багацці фальклору, з другога, характарызуюць паэму «Курган».

Праблема песняра-паэта не была новай у літаратуры. Але для параўнаўча маладой беларускай літаратуры гэта была адна з найбольш актуальных праблем, якая хвалявала не аднаго Я. Купалу.

Высунутая яшчэ Гётэ ў «Дэр Зёнгер» (пясняр) праблема песняра, які «спявае як птушка на галінцы», спявае для сябе, для сваёй асалоды, была падхоплена многімі паэтамі і ў рускай літаратуры пачатку ...стагоддзя. У гэты-ж перыяд фарміру...ы лозунг «мастацтва для мастацтва». ...творы Гётэ пясняр, запрошаны кара...для пацехі ў свой палац, адмаўляецца ... узнагароды:

По божьей воле я пою,
Как птичка в поднебесьи.
(Пераклад Тютчава).

...а, што Капеін, перакладаючы «...Зёнгер» на рускую мову, замяніў абстрактнае і ідэальнае сярэдневякоўе Гётэ маляўнічай архаікай рускага быту з эпохі князя Уладзіміра. Астатняе супадае з Гётэ. Гусляра Уладзімір хоча ўзнагародзіць, але той адмаўляецца і гаворыць: «Я пою, как птица в поле, оживленная весной».

Эпізод запрашэння песняра на бал сустракаецца ў літаратуры не ўпершыню і становіцца літаратурнай традыцыяй. Гэта традыцыя ідзе ад народнай творчасці. У былінах «Садко», «Дабрыня і Алёша» гусляр ці гусляры запрашаюцца на вяселле князем і пацяшаюць яго. Садко грае на гуслях яраўчатых, каб пацешыць марскога цара і суняць яго разгульнае шаленства.

Адной з цэнтральных праблем творчасці Пушкіна была праблема песняра. Даволі прыгадаць яговых «Прарока», «Помнік», «Паэту», «Песнь аб вешчым Олегу» і інш. Волхв творыць для сябе, ён незалежны, гэта звышчалавек:

Волхвы не боятся могучих владык,
А княжеский дар им не нужен;
Правдив и свободен их вещий язык
И с волей небесною дружен!..

Купалаўскія радкі:

Сілен, княжа, караць, галаву сілен зняць, —
Не скуеш толькі дум ланцугамі—

і па форме і па сваёй унутранай значымасці родны з пушкінскімі. Перад Пушкіным увесь час стаяў ідэал вольнага, незалежнага паэта. Ён імкнуўся прагнаць вялікасвецкую чэрнь ад святога алтара паэзіі, бо ён высока ставіў значэнне мастацтва і званне паэта. Пушкін добра ўяўляў, што вечна будзе жыць той паэт, які звязан з лёсам народа. Такое ўспрыняцце ролі паэта перайшло да Я. Купалы ад Пушкіна праз Некрасава. Пясняр Я. Купалы, гэта паэт-грамадзянін.

Самая назва паэмы «Курган» паказвае на яе фальклорнае паходжанне.

Колькі легенд, казак, песень, паданняў стварыў народ аб курганах, курганах-магілах! То яны авеяны фантастычнымі апавяданнямі аб выхадзе з магіл зданяў без пары загінуўшых (Шэйн — «Расказы і легенды аб курганах і каменях», Н. Кастамараў—«Магільныя паданні»); то гэта ўрачыста—гераічныя песні аб багатырах-волатах, загінуўшых за народ і пахаваных у вялікіх курганах-магілах (Сементоўскі — «Беларускія дрэўнасці»).

«На Віцебшчыне ёсць курган-магіла Галубец на беразе возера каля вёскі Галубцовай, аб якой народ расказвае, што ў начную пару (Купала выкарыстоўвае гэты зачын казачніка: «Лет назад таму сотня ці болей», «кажуць людзі: ў год раз ночкай з гуслямі дзед...» і г. д.) на яе вяршыні з'яўляецца сівы дзед-старац, які сядзіць на белым, як снег, бліскучым кані, хаваючыся пры малейшым да іх набліжэнні» (Сементоўскі—«Беларускія дрэўнасці»).

Чулая душа паэта разгадала таямніцы дзіўных легенд, казак, у якіх апаэтызіраваны курганы.

Яшчэ да напісання паэмы Я. Купала не раз кідаў свой вострыя паэтычны погляд на курганы:

Хто калі сюды заглянуў,
Дзе ляжаць яны,—
Як хмурын пагляд туманны,
Сумны курганы.
Хто зачэпіцца іх межаў,
Хто чапне іх сны?
Як званы на цёмнай вежы
Стогнуць курганы.

Распрацоўваючы ў радзе вершаў тэму аб ролі паэзіі, Я. Купала паступова намацваў і вобраз гусляра для «Кургана», які быў-бы выразіцелем дум народных. Такі паступовы адбор сэнсавых элементаў для напісання «Кургана» сказваецца не толькі ў стварэнні вершаў аб курганах, аб гусляру, але ў вершах пра князя, пра палац («Запушчаны палац», «Палац», «Песня-казка» і інш).

Тэма гэта спатрэбілася Я. Купале не толькі для таго, каб па-свойму апець курганы, гэту «памяць людскую», але і для таго, каб выразіць сваё паэтычнае «крэдо» і каб унесці гістарычную тэматыку ў беларускую паэзію. На аснове запісаных Шэйнам паданняў Я. Купала піша свае вядомыя паэмы «Магіла льва» і «Бандароўна».

У праграму «Нашай нівы» цікавасць да мінулага нашага народа ўваходзіла як першачарговая задача. Але тут патрабаванні былі няяснымі, расплывучатымі. Старасветчына-ж Я. Купалы была жывой, дзейснай. Фальклорныя паданні аб курганах звязваюцца ў Я. Купалы з тэмай рэволюцыйнай барацьбы супроць цёмных варожых сіл.

Прыведзены на вяселле княжны купалаўскі гусляр не «халоп», а грозны суддзя, абаронец інтарэсаў вольналюбівага народа, сын народа. Смела ўступаючы ў паядынак з праслаўленым на ўвесь свет князем, гусляр бясстрашна кідае яму гнеўныя словы:

Гэй, ты, князь! Гэй, праслаўны на цэлы бел-свет.
Не такую задумаў ты думу,—
Не дае гуслярам сказу золата цвет,
Белых харамаў п'яныя шумы.
. . . .
Стол ты ўставіў ядой, касцей шмат пад сталом,—
Гэта косці бядноты рабочай;
Пацяшаешся белым, чырвоным віном,—
Гэта—слёзы нядолі сірочай.

Народ пачынае складаць аб гусляру паданні:

Лет за сотню звёў час, ці і болей мо' лет.
Зацвілі пераказы ў народзе;
Кажуць людзі: ў год раз ночкай з гуслямі дзед
З кургана, як снег белы, выходзе.
Гуслі строіць свае, струны звонка звіняць,
Жменяй водзіць па іх абамлелай,
І ўсё нешта пяе, што жывым не паняць,
І на месяц глядзіць, як сам, белы.

І хоць пачатак і, асабліва, канец паэмы напісаны ў спакойным эпічным стылі, авеяны ціхім сумам, уся паэма поўна вялікай сілы трагізму. Гэта сказваецца і ў тым, што гусляр адзін выступае супроць магутнага князя, і ў яго гібелі.

Трагізм узмацняецца кантраснасцю малюнкаў. Непадкупны гусляр выкрывае пабудаванае на касцях «бядноты рабочай» раскошнае жыццё князя. Князь з дворняй п'е асалоду, а браццi гусляра з голаду пухнуць, галодныя, раздзетыя.

Моманты казачнай фантастыкі ў Я. Купалы падпарадкаваны рэволюцыйнай трактоўцы вобраза гусляра і пазбаўлены рэлігійна-ідэалістычных адценняў.

Вобраз гусляра абуджаў самыя смелыя, адважныя і гераічныя пачуцці, прагу да змагання.

Падзеі ў паэме не прыўрочаны да пэўнага часу. Я. Купала тут не гісторык, не археолаг, а паэт, — гістарычная хранолёгія парушана ў паэме, і, зноў-такі, гэта ідзе ад фальклорнай традыцыі.

Апісанне самога гусляра:

Невыдумная світка — убор на плячах,
Барада, як снег белы — такая,
Незвычайны агонь у задумных вачах,
На каленях ляглі гуслі-баі—

створана ў стылі квяцістага народнага лубка ў лепшым сэнсе гэтага слова.

Майстэрства, з якім Я. Купала паказаў магічную сілу грання гусляра («Кажуць — толькі як выйдзе і ўдарыць як ён па струнах з неадступнаю песняй, —сон злятае з павек, болю цішыцца стогн, не шумяць ясакары, чарэсні; Пушча-лес не шуміць, белка, лось не бяжыць, Салавей- птушка ў той час сціхае») — можа быць параўнана толькі з граннем Вейнемейнена з «Калевалы»:

Вот играет Вейнемейнен—
Не осталось зверя в лесе
Изо всех четвероногих,
Зверя с длинными ногами,
Чтоб не шел туда послушать
И, ликуя, подивиться.
Белка весело цеплялась,
С ветки прыгала на ветку;
Подбежали горностаи,
Возле изгороди сели,
Лось запрыгал на поляне..
(«Калевала», 41-я руна).

У гэтым-жа годзе, калі напісан «Курган» (1910), на старонках «Нашай нівы» пачынае друкаваць сваю выдатную паэму «Новая зямля» Якуб Колас, пачынае выступаць у літаратуры з сваімі цудоўнымі навеламі З. Бядуля.

З гэтага часу беларуская літаратура пачынае выходзіць на шырокі светлы прастор, заваёўваючы гушчы чытачоў і робячыся духоўнай патрэбай усяго беларускага працоўнага народа.

„Жалейка“ Я. Купал... і царская цэнзура

З архіўных ма...рыялаў

Як толькі першы зборнік в... Я. Купалы «Жалейка» выйшаў у ... царская цэнзура ў тэрміновым п... налажыла суровую забарону на гэт... «Жалейка» не была дазволена да рас...сюджвання. Увесь тыраж кнігі ў лістапад... 1908 года быў канфіскаван і вывезен с... складу выдавецтва «Загляне сонца і ... наша віконца» у Пецярбургу.

Але вострыя сацыяльна-насычаныя рэволюцыйна-дэмакратычныя вершы Я. Купалы шырока распаўсюджваліся на ўсёй Беларусі і далёка за яе межамі ў рукапісах, пашыраліся ў вуснай форме. Аб гэтым увесь час даносілі ў паліцыю чыны ахран...кі. І праз некаторы час царская цэнзур... пад націскам грамадскасці, вымуша... была зняць сваю забарону са збо...ніка «Жалейка». Аб гэтым факце паведа...ляла сваім чытачам газета «Минское эхо» у № 155 ад 11 снежня 1908 года, дадаю... ад сябе наступную заўвагу: «Дазвол... цяпер да свабоднага звароту кнігу ... вітага паэта — знатака і песняра ... рускай сялянскай «долі», — можна а... мацъ ва ўсіх кніжных магазінах гор...

Кніга Я. Купалы «Жалейка» атры... праз гэту затрымку царскай цэнзу... яшчэ большую папулярнасць сярод пр...цоўных мас і тыраж яе быў раскуплен ... некалькі дзён.

Л. ДУШМА...

Адказны рэдактар І. Д. ГУРСКІ.

1496 Адрас рэдакцыі газеты: Мінск, Савецкая,76, Дом пісьменніка. Тэлефон 25-394. Газета «Літаратура і Мастацтва» выходзіць штотыднёва.

Мінс... ...ня «Звязды».